ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»
Цэнтральная раённая бібліятэка
Аддзел бібліятэчнага маркетынгу

# ДА ПАЭТЫЧНАГА СЛОВА ДАКРАНІСЯ

***ЗБОРНІК СЦЭНАРНЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ ТВОРЧЫХ СУСТРЭЧ З ЛІТАРАТАРАМІ БРЭСТЧЫНЫ І КОБРЫНШЧЫНЫ***

Кобрын
2021

ББК 78.374.3
Д12

**Складальнік А. М. Міхейкіна-Белякова**

Д12 **Да паэтычнага слова дакраніся** : зборнік сцэнарных матэрыялаў творчых сустрэч з літаратарамі Брэстчыны і Кобрыншчыны / ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел бібліятэчнага маркетынгу ; склад. А. М. Міхейкіна-Белякова. - Кобрын, 2021. – 69 с.

У зборнік увайшлі сцэнарыі творчых сустрэч з літаратарамі Брэстчыны і Кобрыншчыны. Пры складанні зборніка выкарыстаны сцэнарныя матэрыялы аддзела абслугоўвання і інфармацыі і аддзела бібліятэчнага маркетынгу.

Дадзенае выданне прызначана ў дапамогу супрацоўнікам публічных бібліятэк і ўсім тым, хто зацікаўлены ў правядзенні мерапрыемстваў патрыятычнай тэматыкі.

© Складанне. Міхейкіна-Белякова А. М., 2021
© Афармленне. ДУК «Кобрынская РЦБС», 2021

# ЗМЕСТ


- БАЧЫЦЬ СВЕТ ПА-СВОЙМУ
  сустрэча-злёт з паэтамі Кобрыншчыны ______________________С. 4–5
- ВЕРШАПАД ПА-БЕЛАРУСКУ
  паэтычная гадзіна __________________________________________С. 6 – 8
- ГАЛАСЫ ЗЯМЛІ БЕРАСЦЕЙСКАЙ
  літаратурная сустрэча ______________________________________С. 9 – 12
- ГЛЫТОК РОДНЫХ КРЫНІЦ
  літаратурна-музычная кампазіцыя___ ______________________С. 13 – 15
- З ПАЭТЫЧНАЙ КРЫНІЦЫ КОБРЫНШЧЫНЫ
  літаратурная вечарына _________________________________ С. 16 – 22
- ЗАЛАТЫ РОССЫП ВЕРШАЎ
  фестываль паэзіі ________________________________________ С. 23 – 27
- І ВЕРШАМ ГАВАРЫЦЬ ХАЧУ Я
  свята-прэзентацыя новых кніг ____________________________ С. 28 – 38
- КНИЖНАЯ ИМПЕРИЯ
  поэтический нон-стоп____________________________________С. 39 – 42
- ЛЮБЛЮ СТОРОНКУ РОДНУЮ
  презентация поэтического сборника_______________________С. 43 – 44
- НАШЫ ВЫТОКІ : літаратурна-музычны салон______________С. 45 – 48
- ПОГОВОРИМ О НОВОЙ КНИГЕ
  час библиографического краеведения _____________________С. 49 – 50
- ПЯСНЯР ПАЛЕССЯ
  літаратурная вечарына ___________________________________С. 51 – 55
- МУЗЫКА ДУШИ
  творческий вечер поэта и композитора ____________________С. 56 – 60
- ПРАЗДНИЧНОЕ АССОРТИ
  устный журнал____________________________________________С. 61 – 65
- ЧЕМ ПАХНЕТ СЧАСТЬЕ
  презентация книги _______________________________________С. 66 – 68

# БАЧЫЦЬ СВЕТ ПА-СВОЙМУ

*Бачыць свет па-свойму : сустрэча-злёт з паэтамі Кобрыншчыны / ДУК "Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма", Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі. – Кобрын, 2018.*

**Вядучы 1.** Паэзія, напэўна, як ніякая іншая, творчая ніва, прыцягвае да сябе людзей. Амаль кожны чалавек хоць адзін раз у жыцці адчувае ў душы нейкае патаемнае, раней незнаёмае пачуццё, якое прымушае ўзяцца за пяро і пісаць у рыфму. І гэта, думаецца, нармальная з'ява. І нятрэба баяцца сваіх пачуццяў. Праз паэзію чалавек пазнае сябе. Яго духоўны свет становіцца багацейшым.

**Вядучы 2.** Паэзія – гэта не толькі ўменне скласці строфы ды падабраць удалую рыфму. Акрамя рыфмы, рытма, у ёй абавязкова павінна быць думка, уласны погляд на свет, не пазычаны паэтычны почырк. Гэта галоўнае ў паэзіі, без гэтага паэзіі не бывае...

**Вядучы 1.** Сёння ў нашай зале сабраліся людзі, якія валодаюць творчай іскрынкай, неабыякавыя да лёсу нашай культурнай спадчыны. Розныя людзі, розны ўзрост, розныя думкі... У многіх ёсць цікавыя знаходкі, свежыя вобразы, свой стыль. Мы запрасілі да нас і сталых аўтараў, і тых, хто толькі спрабуе свае сілы ў паэзіі і выкананні пісаць. Творы іх розныя па ступені дасканаласці, не падобныя адзін на адзін. Аднак яны ёсць і гэта радуе. Значыць не толькі хлеб надзённы хвалюе людзей, хочацца ім і нечага большага – духоўна напоўненага жыцця, цёплай, шчы-рай размовы паэтычным радком.

**Вядучы 2.** Ведаеце, наогул гэта дзіўна, што ў наш нялёгкі час знаходзяцца людзі, якія яшчэ пішуць вершы. А калі пішуць, то, вядома, хочуць, каб іх нехта чытаў або слухаў... Аб тым, што хвалюе нашых аўтараў, натхняе іх да творчасці, дае магчымасць знаходзіць цудоўныя тайнічкі паэзіі, мы сёння запросім расказаць нашых паважаных гасцей.

**Вядучы 1.** З вялікім задавальненнм перадаем слова добрым сябрам нашай бібліятэкі, тым, хто не раз прымаў удзел у шэрагу нашых мерапрыемстваў. Іх імёны знаёмы многім па апублікаваным на старонках газет, часопісаў вершам, выдадзеным кнігам. Калі ласка, Леанід Глушко, Ніна Дрык, Ігар Сідарук. Гэтыя людзі заўсёды з энтузіязмам адгукаюцца на нашы просьбы, і сёння мы рады бачыць іх зноў. Вам слова...

**Вядучы 2.** Выдалі свае першыя кнігі Міхаіл Чайнікаў і Лідзія Жук – настаўнікі Кобрынскага вучылішча тэкстыльшчыкаў №153. Знаёмства з іх творчасцю стала для нас сапраўдным адкрыццём. Калі ласка, знаёмцеся, Лідзія Мікалаеўна Жук, Міхаіл Юр'евіч Чайнікаў.

**Вядучы 1.** Літаратура, паэзія – не менш адказная справа, чым усе іншыя. Патрабавальнасць да сябе і да слова – вось што перш за ўсё павінен узяць на ўзбраенне пачынаючы паэт. Нашы маладыя паэты пішуць па-рознаму, але ў іх вершах ёсць галоўнае – вера, нягледзячы ні на што, у лепшае. І няхай гэта не шадэўры сусветныя – шчыры радок таксама мае права на жыццё. Запрашаем да размовы нашых гасцей. Калі ласка Вікторыя Лукашук, Зінаіда Навасад, Сяргей Страчук, Леанід Валасюк, Ганна Міхалюк.

**Вядучы 2.** Калі мы рыхтаваліся да нашай сустрэчы, праглядзелі падшыўкі "Кобрынскага весніка", у т.л. літаратурную старонку за многія гады. Усе вы ведаеце, што пры раённай газеце існавала літаратурнае аб'яднанне "Узлёт", якое адкрыла шмат новых імён, дало жыццё новым вершам, байкам, апавяданням. Літаратурная старонка прапанавала чарговыя падборкі твораў нашых кобрынскіх аўтараў, не толькі ўжо вядомых, але і тых, хто друкаваўся ўпершыню.

І вельмі прыемна, што пасля перапынку ў рубрыцы "Натхненне" нашай газеты зноў пачала існаваць гэта старонка. Стварылася магчымасць рэгулярна знаёміць нашых чытачоў з новымі літаратурнымі здабыткамі Кобрыншчыны. У нас ёсць такое пажаданне-прапанова: каб гэта старонка змяшчала не толькі творы, але і кароткія звесткі аб іх аўтарах. Ад гэтага, думаем, літаратурная старонка толькі б выйграла. Перадаем слова рэдактару газеты "Кобрынскі веснік" Алене Мікалаеўне Жук, карэспандэнту Марыі Пятроўне Хільчук.

**Вядучы 1.** Паважаныя сябры!

Хочацца звярнуць вашу ўвагу на кніжную выставу "З літаратурнай крыніцы Кобрыншчыны", на якой прадстаўлены і кнігі, і артыкулы з газет, часопісаў, і папкі-дас'е нашых кобрынскіх аўтараў. Ведаеце, да гэтых матэрыялаў вельмі часта звяртаюцца нашы чытачы. А вучні школ, наогул, вывучаюць па беларускай літаратуры творчасць аднаго з сучасных мясцовых паэтаў. І матэрыялы з папкідас'е на Л.Глушко, Н.Дрык, І. Сідарука карыстаюцца вялікім попытам.

**Вядучы 2.** Нам застаецца падзякаваць вас, паважаныя сябры, за атрыманае задавальненне. Хочацца спадзявацца, што паэтычны голас Кобрыншчыны будзе мацнець; што творчая муза не пакіне вас, і мы яшчэ не раз сустрэнемся з вашымі творамі. Новых сіл Вам у паэтычных пошуках, далейшых творчых поспехаў.

Дзякуй за ўвагу!



# ВЕРШАПАД ПА-БЕЛАРУСКУ

*Ефціфеева, Н. Вершапад па-беларуску : паэтычная гадзіна / ДУК "Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма", Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел бібліятэчнага маркетынгу ; Наталля Ефціфеева. – Кобрын, 2020.*

**1 вядучы:** Добры дзень, шаноўныя госці бібліятэкі. Як вы ведаеце, у нашай краіне Дзень беларускага пісьменства ў гэтым годзе святкуецца 6 верасня. Таму і тэма нашай сустрэчы абрана невыпадкова – беларуская паэзія. Але спачатку мы нагадаем гісторыю названага свята.

**2 вядучы:** Дзень беларускага пісьменства святкуецца штогод у першую нядзелю верасня. Яго мэта – паказаць адзінства беларускага друкаванага слова з гісторыяй і культурай беларускага народа, адлюстраванне гістарычнага шляху пісьменнасці і друку Беларусі. Традыцыйна свята ладзіцца ў гарадах, якія з'яўляюцца гістарычнымі цэнтрамі культуры, навукі, літаратуры і кнігадрукавання.

**1 вядучы:** Упершыню святочныя мерапрыемствы Дня беларускага пісьменства прайшлі… - нешта я запамятавала дзе. Можа, мне вучні падкажуць? Калі ласка, адкажыце, дзе святкаваўся Дзень беларускага пісьменства ўпершыню?

*Адказы вучняў.* ***(У Полацку.)***

**1 вядучы:** Сапраўды, у старажытным Полацку. Дарэчы, гэты слаўны горад быў сталіцай свята тройчы – у 1994-м, 2003-м і 2017 гадах. І невыпадкова. Можа, вы мне зноў падкажаце, радзімай якіх вядомых беларускіх асветнікаў з'яўляецца гэты горад?

*Адказы вучняў.* ***(Ефрасіння Полацкая, Сімяон Полацкі, Францыск Скарына.)***

**2 вядучы:** А цяпер прасочым за ўсёй геаграфіяй свята. Увага на экран. Як ужо гаварылася, Полацк быў сталіцай Дня беларускага пісьменства тройчы. У 2017 годзе святкавалася 500-годдзе беларускага кнігадрукавання. Зразумела, што Дзень беларускага пісьменства адзначылі на радзіме першадрукага Францыска Скарыны.

Двойчы Дзень беларускага пісьменства святкаваўся ў Тураве і Заслаўі. У спісе сталіц свята таксама Навагрудак, Нясвіж, Орша, Пінск, Мсціслаў, Мір, Камянец, Паставы, Шклоў, Барысаў, Смаргонь, Хойнікі, Ганцавічы, Глыбокае, Быхаў, Шчучын, Рагачоў, Іванава, Слонім.

**1 вядучы:** Спадзяюся, што вы дапаможаце назваць тыя з пералічаных гарадоў, якія знаходзяцца ў Брэсцкай вобласці, ці ў якіх гарадах Брэсцкай вобласці праходзіў Дзень беларускага пісьменства?

*Адказы вучняў.* ***(Пінск – 1999, Камянец – 2005, Ганцавічы – 2011, Іванава – 2018.)***

**1 вядучы:** А ці хочаце вы, каб Дзень беларускага пісьменства прайшоў у Кобрыне?

*Адказы вучняў.*

**2 вядучы:** Падкажыце, які горад ў наступныя выхадныя стане сталіцай Дня беларускага пісьменства.

*Адказы вучняў. (**Бялынічы Магілёўскай вобласці.)***

**2 вядучы:** Галоўным днём свята стане 6 верасня, але шмат цікавых мерапрыемстваў будзе не толькі ў гэты дзень, але і напярэдадні, у тым ліку і сёння. Знакавай тэмай Дня беларускага пісьменства гэтага года стане 90-годдзе яднаго з яскравых пісьменнікаў Беларусі Уладзіміра Караткевіча. У дні святкавання госці і жыхары горада змогуць пазнаёміцца з новымі кніжнымі выданнямі, сустрэцца з беларускімі і замежнымі літаратарамі, журналістамі, выдаўцамі, паслухаць выступленні паэтаў і пісьменнікаў, творчых калектываў і выканаўцаў. Пройдуць навукова-практычныя канферэнцыі, а таксама некалькі адкрыццяў: памятная скульптура “З’ява абраза” каля царквы ў гонар абраза Божай Маці Бялынічскай; новы будынак музея, дзе ўпершыню з’явіцца зала “Духоўнасць”.

**1 вядучы:** Таксама па традыцыі на Дне беларускага пісьменства ўзнагароджваюцца пераможцы конкурса на лепшы літаратурны твор года. Цікава, а ці ведаеце вы тых, хто атрымае Нацыянальную літаратурную прэмію ў гэтым годзе.

*Адказы вучняў. (У намінацыі “Проза” – **Уладзімір Сцяпан** за зборнік аповесцяў і апавяданняў “Хвалі”;*

*намінацыя “Паэзія” – **Валерый Грышкавец** за кнігу выбраных вершаў “Остаюсь навсегда”;*

*“Дзіцячая літаратура” – **Кацярына Хадасевіч-Лісавая** – кніга-квэст “Ключ ад Вялікай Каштоўнасці”;*

*“Драматургія” – не вызначалася;*

*“Крытыка і літаратуразнаўства” – **Іван Саверчанка** “Магія слова” (пра беларускіх пісьменнікаў 12 – 17 стагоддзяў і іх творчасць;*

*“Публіцыстыка” – **Ігар Пракаповіч,** кніга “Пастаўшчына” з серыі “Падарожжа па родным краі”;*

*“Дэбют” – **Вольга Нікіценка (Івалга),** зборнік вершаў “Сузор’е птушкі” )*

**1 вядучы:** Дарэчы, дзве кнігі з пералічаных ёсць у фондзе нашай бібліятэкі. Гэта “Хвалі” Уладзіміра Сцяпана і “Магія слова” Івана Саверчанкі.

**2 вядучы:** А цяпер давайце будзем святкаваць Дзень беларускага пісьменства, але незвычайным спосабам. Мы з вамі пагуляем у паэтычнае лато “Вершапад па-беларуску”. Са скарбонкі будзе даставацца паперка з назвай тэмы, а тыя, у каго ёсць адпаведныя вершы, выходзьце наперад і чытайце падрыхтаваныя творы. А можа, хто з прысутных піша вершы? Тады вы таксама далучайцеся да гульні, але памятайце, што прымаюцца толькі

беларускамоўныя творы. Але мне патрэбен памочнік, які будзе даставаць са скарбонкі тэмы. Хто жадае дапамагчы?

*Паэтычнае лато "Вершапад па-беларуску":*

*У дзяцей ёсць падрыхтаваныя напярэдадні вершы беларускіх паэтаў.*

*Вядучы выцягвае са скарбонкі назвы тэм, а дзеці, у якіх ёсць вершы на дадзеную тэму, выходзяць і чытаюць іх. У гульне прымаюць удзел і паэты – члены літаратурнага клуба "ПаэтыКо" (яны чытаюць свае вершы).*

**1 вядучы:** Вось і атрымаўся ў нас сапраўдны вершапад. Але мы прадоўжым яго. Сёння ў нас у гасцях дзве кобрынкія паэткі, вершы якіх вы ўжо пачулі на нашым мерапрыемстве. А цяпер знаёмімся бліжэй. Сустракаем Марыну Міхалюк, якая некалькі слоў скажа пра сябе, пра тое, як яна пачынала пісаць, і прачытае яшчэ адзін-два вершы.

***Марыны Міхалюк.***

**1 вядучы:** Яшчэ адным госцем нашай паэтычнай гадзіны з'яўляецца мая саведучая – Наталля Кандрашук, кіраўнік літаратурнага клуба "ПаэтыКо", які працуе пры нашай бібліятэцы.

***Наталля Кандрашук.***

**1 вядучы:** Калі ў вас ёсць пытанні да нашых паэтак, можаце задаць іх.

*Пытанні дзяцей і настаўніка, адказы.*

**1 вядучы:** Хто зацікавіўся творчасцю нашых паэтак, можа набыць іх кнігі. Спадзяемся, што вам, шаноўныя госці, было цікава правесці час разам з намі. Дзякуй за ўвагу! Да новых сустрэч!



# ГАЛАСЫ ЗЯМЛІ БЕРАСЦЕЙСКАЙ

*Галасы зямлі Берасцейскай : літаратурная сустрэча / ДУК "Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма", Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі. – Кобрын, 2016.*

***Мэта:*** паглыбіць веды, больш падрабязна пазнаёміцца з грамадскім літаратурным аб'яднаннем Брэсцкага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, з творчасцю яго членаў.

***Афармленне:***

выстава – панарама "***На літаратурным Парнасе Берасцейшчыны*** " (да 10-годдзя з часу ўтварэння Брэсцкага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі )

***Абсталяванне:*** мультымедыйная ўстаноўка, ноутбук, аўдыязапісы, мікрафоны.

***Форма правядзення***: фармат відэапрэзентацыі ў спалучэнні з фарматам вольнага дыялогу.

*На экране – назва мерапрыемства «Галасы зямлі Берасцейскай"*

**Вядучы.** Прывітанне, паважаныя сябры! Сёння ў нашай бібліятэцы - літаратурная сустрэча «***Галасы зямлі Берасцейскай»***, прысвечаная 10-годдзю з часу ўтварэння Брэсцкага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі.

*На экране – фота гасцей літаратурнай сустрэчы – літаратараў Анатоля Крэйдзіча, Анатоля Брытуна, Міхася Куляша, кабрынчан Наталлі Касцюк і Вячаслава Бурдыкі.*

**Вядучы**. Мы шчыра вітаем перш за ўсё нашых юбіляраў – членаў гэтага грамадскага літаратурнага аб'яднання. Сёння аб'яднанне прадстаўляюць старшыня Брэсцкага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Анатоль Крэйдзіч, члены аб'яднання Анатоль Брытун, Міхась Кулеш, кабрынчане Наталля Касцюк і Вячаслаў Бурдыка. Таксама мы вітаем шматлікіх аматараў літаратуры, якія прыйшлі на нашу сустрэчу: настаўнікаў-філолагаў, супрацоўнікаў рэдакцыі "Кобрынскі веснік", літаратараў Кобрыншчыны, бібліятэчных работнікаў.

*На экране – інфармацыя аб Брэсцкім абласным аддзяленні Саюза пісьменнікаў Беларусі.*

**Вядучы**. Брэсцкае абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі створана 15 студзеня 2006 года. У яго склад увайшлі 15 чалавек. Па стане на 1 лютага 2010 года аддзяленне налічвае 40 чалавек. Сярод іх: мужчын – 31, жанчын – 9, беларускамоўных – 21, рускамоўных – 19, празаікаў - 16, паэтаў

- 23, крытыкаў – 1. Склад Савета аддзялення: Анатоль Крэйдзіч, Зінаіда Дудзюк, Любоў Красеўская, Валерый Грышкавец, Анатоль Бензярук, Георгій Тамашэвіч, Вячаслаў Бурдыка, Марыя Ляшук. Такая інфармацыя змешчана на сайце Брэсцкага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі. Інфармацыя не зусім актуальная на сённяшні дзень, але дапоўняць яе нашы сённяшнія госці, і перш за ўсё старшыня Брэсцкага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі ***Анатоль Мікалаевіч Крэйдзіч.***

*На экране – фота Анатоля Крэйдзіча, інфармацыя аб ім.*

**Вядучы.** Перш чым перадаць слова Анатолю Мікалаевічу - невялікі ўступ. У 2012 годзе, каб зразумець, як чытаюць беларускіх літаратараў, Саюз пісьменнікаў Беларусі правёў цікавае даследаванне, у выніку якога быў складзены рэйтынг самых папулярных сучасных аўтараў Беларусі. Як адзначыў старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай Чаргінец, быў складзены спіс з 48 аўтараў і разасланы ва ўсе бібліятэкі рэспублікі, з мэтай высвятліць наяўнасць дадзеных кніг, іх колькасць і колькасць чытанняў. Вынікаі даследавання паказалі, што за 2 гады творы 48 беларускіх аўтараў прачытала 2,5 мільёна чалавек. Самымі чытаемымі беларускімі аўтарамі сталі Анатоль Казлоў і…Анатоль Крэйдзіч, які нягледячы на сваю занятасць сёння ў нас у гасцях, за што мы яму вельмі ўдзячны.

Анатоль Крейдзіч - галоўны рэдактар установы «Рэдакцыя газеты «Чырвоная звязда» г. Іванава і праграмы радыёвяшчання «Гаворыць Іванава». З 2006 года з'яўляецца старшынёй Брэсцкага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, лаўрэат часопіса «Маладосць» (1992), прэміі Беларускага Саюза Моладзі ў вобласці журналістыкі і літаратуры (1995), прэміі часопіса Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Беларуская думка» (2005), прэміі Беларускага саюза журналістаў «Залатое пяро» за праблемныя публіцыстычныя нарысы на тэмы культуры, мовы і нацыянальных традыцый (2009).

У 2008-м узнагароджаны Ганаровай граматай рэдакцыйна-выдавецкай установы «Літаратура і Мастацтва» «За вялікую працу па прапагандзе творчасці пісьменнікаў Брэстчыны і за плённую дзейнасць у беларускай літаратуры і мастацтве». У 2011 г. - Ганаровай граматай Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў "За значительный вклад в развитие и пропаганду творчества писателей Брестчины, инициативность и высокие творческие достижения в журналистике». У студзені 2012 г. Крейдзічу А.Н. аб'яўлена Падзяка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Вам слова, Анатоль Мікалаевіч!

*Слова даецца Анатолю Крэйдзічу.*

*На экране – фота Анатоля Брытуна, інфармацыя аб ім.*

**Вядучы.** ***Анатоль Брытун…*** Нарадзіўся ў вёсцы Баранцы Жабінкаўскага раёна. Пасля васьмі класаў Верхалескай школы Кобрынскага раёна вучыўся ў тэхнікуме ў Пінску, затым паступіў у сельгасакадэмію. Працаваў інжынерам у дырэкцыі «Галоўпалессеводбуда». Пасля працы

працягваў вучобу ў Брэсцкім педагагічным інстытуце на факультэце грамадскіх прафесій. Пасля вучобы прапанавалі працу гіда-перакладчыка ў БММТ «Спутнік», «Інтурысце» і «Інтурбюро». Праз некаторы час, дзякуючы веданню замежнай мовы, стаў інспектарам Брэсцкай мытні, дзе працую ўжо больш за дваццаць год. Анатоль Брытун з поспехам сумяшчае працу ў Брэсцкай мытні і напісанне прыгодніцкіх раманаў пра Белавежскую пушчу. Акрамя таго, ён вядзе папулярны блог і актыўна абараняе беларускую гісторыю на форумах. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі, аўтар кнігі «Пах мускусу» (2012 год) і іншых гістарычна-прыгодніцкіх твораў. У 2015 г. надрукаваны яго раман “Сяліба”, у якім шмат старонак прысвечана менавіта кобрынскаму краю.

*Слова даецца Анатолю. Брытуну.*

*На экране – фота Міхаіла Куляша, інфармацыя аб ім.*

**Вядучы.** ***Міхаіл Кулеш*** не навічок у паэзіі. Ён – аўтар трох кніг, член Саюза пісьменнікаў Беларусі, часта публікуецца ў перыядычных выданнях. Шчырасць, вельмі пачуццёвая, неабыякавая засяроджанасць ёсць у вершах Міхаіла Куляша. З вялікім хваляваннем чытаеш яго радкі пра маці, пра родныя мясціны, пра блізкія і далёкія дарогі, па якіх ён прайшоў і праехаў, пра сустрэчы і развітанні… Проста, дасціпна, без выкрунтасаў і спецэфектаў.

*Слова даецца Міхаілу Куляшу.*

*На экране – фота выставы-панарамы ”На літаратурным Парнасе Берасцейшчыны”*

**Вядучы.** Дарэчы, хачу звярнуць вашу ўвагу на выставу-панараму”***На літаратурным Парнасе Берасцейшчыны”***, на якой прадстаўлены кнігі, публікацыі ў часопісах літаратараў Брэсцкага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, а таксама звесткі аб іх жыцці і дзейнасці. Безумоўна, гэта далёка не поўны спіс твораў нашых землякоў.

*На экране – фота Наталлі Касцюк і Вячаслава Бурдыкі*

**Вядучы.** Нам вельмі прыемна, што ў Кобрыне жывуць літаратары, якія з’яўляюцца членамі Брэсцкага аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі. Гэта ***Наталля Веніямінаўна Касцюк*** і ***Вячаслаў Віктаравіч Бурдыка***.

*На экране – фота Наталлі Касцюк, інфармацыя аб ёй.*

**Вядучы.** Сябры! Кажуць, што самы яскравы крытэрый добрага мастацкага твора - калі пасля яго чытання хочацца плакаць... Гэта значыць, што аўтару ўдалося галоўнае - закрануць струны нашай душы. І хоць сустрэць такія прыклады сярод сучаснай літаратуры атрымліваецца, на жаль, не так ужо часта, кожны з іх, нібыта светлы прамень сонца, пакідае свой след назаўсёды...

Менавіта такое ўражанне аказваюць апавяданні сённяшняй госці ***Наталлі Веніямінаўны Касцюк***. Наталля Веніамінаўна каля 30 гадоў аддала

педагагічнай рабоце ў Кобрынскім дзіцячым доме, і нядзіўна, што менавіта яны - так несправядліва пакрыўджаныя жорсткім і няўмольным лесам, але па-свойму чыстыя і светлыя дзеці, - сталі героямі яе кароткіх твораў. У 2010 г.у Наталлі Касцюк, дарэчы, па благаславенню Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага, Патрыяршага экзарха Беларусі Філарэта, выйшла першая кніга “Детдомовские рассказы". А таксама Наталля Касцюк - аўтар іншых празаічных твораў, якія публікаваліся ў абласных і рэспубліканскіх выданнях, у тым ліку ў рэспубліканскім часопісу “Нёман”, маскоўскім часопісе “Фома”.

Вам слова, Наталля Веніямінаўна!

*Слова даецца Наталлі Касцюк*

*На экране – фота Вячаслава Бурдык , інфармацыя аб ім.*

**Вядучы.** ***Вячаслаў Віктаравіч Бурдыка***. Месца нараджэння: Мядзельскі раён Мінскай вобласці. Беларускі пісьменнік, журналіст. Член Беларускага саюза журналістаў і Саюза пісьменнікаў Беларусі. Скончыў факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1979 г.), Кіеўскі інстытут паліталогіі і сацыяльнага кіравання (1992 г.). Працаваў на розных пасадах у раённых газетах Мінскай і Брэсцкай абласцей, у рэдакцыі брэсцкай абласной газеты "Заря". З 2006 г. – працуе адказным сакратаром Брэсцкай абласной газеты “Народная трыбуна”. Выступае ў друку з апавяданнямі. Ён – аўтар кнігі “Яхта смерці” (дэтэктыўны раман).

Вячаслаў Віктаравіч, калі ласка, да мікрафону.

*Слова даецца Вячаславу Бурдыку.*

**Вядучы.** Сябры! Ёсць літаратары сусветна вядомыя. Ёсць тыя, якія добра вядомы ў сваёй краіне. А яшчэ ёсць тыя, якія жывуць сярод нас, працуюць, радуюцца жыццю, ствараюць сем’і і твораць, бо гэта – іх стан душы, патрэба і сутнасць існавання. І сёння наша сустрэча была менавіта з такімі творчымі людзьмі, нашымі землякамі.

«Понять литературу, не зная мест, где она родилась, не менее трудно, чем понять чужую мысль, не зная языка, на котором она выражена. Ни поэзия, ни литература не существуют сами по себе: они вырастают на родной почве и могут быть понятны только в связи со своей родной страной», - гэтыя словы акадэміка Дзмітрыя Ліхачова зразумелы кожнаму.

Мне застаецца толькі пажадаць усім здароўя, творчасці, поспехаў.

Да новых творчых сустрэч, паважаныя сябры!



# ГЛЫТОК РОДНЫХ КРЫНІЦ

*Ефціфеева, Н. Глыток родных крыніц : літаратурна-музычная кампазіцыя / ДУК "Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма", Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел бібліятэчнага маркетынгу; Наталля Ефціфеева. – Кобрын, 2020.*

**Вядучая:** Добры дзень, шаноўныя сябры!
Вас вітаем словам роднай мовы
І жадаем сёння падарыць
Вершаў-песень карагод мясцовы.

Кожнаму чалавеку ўласцівая любоў да роднага краю, да тых мясцін, дзе ён нарадзіўся і дзе прайшло яго дзяцінства, дзе ён жыве цяпер. Таму радзіма і з'яўляецца адной з паэтычных муз. Кобрынскія паэты па глыточку п'юць натхненне з родных крыніц, а гэта – бацькоўскі дом, Кобрыншчына, блізкія сэрцу краявіды. Улюбёнасць у малую радзіму і яе прыроду паволі перацякае на паперу, зарыфмоўваючы пачуцці, эмоцыі, назіранні. Сёння мы пазнаёмім вас з творчасцю членаў літаратурнага клуба "ПоэтиКо", які дзейнічае пры Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэцы. У клубе абъяднаны паэты розных нацыянальнасцей, але ўсе яны любяць сваю Радзіму – Беларусь. Сустракайце Сцяпана Давыдзюка з вершам на ўкраінскай мове "Кохана Беларусь".

***Сцяпан Давыдзюк: "Кохана Беларусь", "Старый Кобрин, или Ретровзгляд".***

**Вядучая:** Дзякуючы Сцяпану Давыдзюку мы быццам вярнуліся ў мінулае і ўспомнілі былыя назвы добразнаёмых нам вуліц. А для маладога пакалення, гэта, магчыма, стала адкрыццём. Тым не менш моладзь таксама цікавіцца гісторыяй роднага горада і ганарыцца сваім кобрынскім куточкам Беларусі. Пра гэта сведчыць верш Ігара Ніжніка "Мой горад".

***Ігар Ніжнік "Мой горад".***

**Вядучая**: "Як ад нараджэньня звяры, што ходзяць у пустыні, ведаюць ямы свае; птушкі, што лётаюць у паветры, ведаюць гнёзды свае; рыбы, што плаваюць па моры і ў рэках, чуюць віры свае; пчолы і тым падобныя бароняць вуллі свае, – так і людзі, дзе нарадзіліся і ўскормлены, да таго месца вялікую ласку маюць", - сказаў некалі беларускі першадрукар Францыск Скарына. Любіць сваю радзіму і кобрынскі бард Вікторыя Лукашук, якая выканае песню "О Беларусь", напісаную на словы Зінаіды Навасад.

***Вікторыя Лукашук "О Беларусь".***

**Вядучая:** Кобрынская зямля багатая на таленты. Яна натхняе мастакоў маляваць прыгожыя краявіды, кампазітараў – складаць цудоўную музыку, а паэтаў – пісаць пранікнёныя вершы. Аддзелам бібліятэчнага маркетынгу Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі выдадзены зборнік вершаў “Глыток родных крыніц”, у які ўвайшлі творы членаў літаратурнага клуба “ПоэтиКо”. Кніга прымеркавана да 80-годдзя Кобрынскага раёна і Года малой радзімы. Выданне складаецца з вершаў сямі паэтаў. Паважаныя сябры, прапануем вашай увазе знаёмства з аўтарамі і іх творчасцю.

Дарэчы, імя адной паэткі ўжо прагучала на нашай імпрэзе. Гэта Зінаіда Навасад. Запрашаем яе пачытаць вершы, якія змешчаны ў гэтай кнізе.

***Зінаіда Навасад: “Наймілейшы куток”, “Сумую па вёсцы”, “Радзіма”, “Наш город”.***

**Вядучая:** Як вы ўжо заўважылі, зборнік “Глыток родных крыніц” – двухмоўны. Тут побач надрукаваны вершы як на беларускай, так і на рускай мовах. Але ёсць адзін паэт, які піша выключна па-руску. Сустракайце Міхаіла Чайнікава.

***Міхаіл Чайнікаў: “Десятый класс, выпуск 1941 года”, “Воспоминания о СШ № 2”, “Во дворе шумели пацаны”, “Улица”.***

**Вядучая:** У працяг тэмы вершаў Міхаіла Чайнікава Вікторыя Лукашук выканае песню “Родная улица”.

***Вікторыя Лукашук “Родная улица”.***

**Вядучая:** Кожнаму з сямі аўтараў у кнізе “Глыток родных крыніц” адведзена па сем старонак. Сем на сем – атрымалася своеасаблівая паэтычная арыфметыка. Але ж творчасць, асабліва літаратурная, – гэта, перш за ўсё, палёт душы, які непадуладны ніякім законам. Таму паэты нярэдка лётаюць у сваіх творах. У доказ гэтаму паслухайце вершы Валянціны Пігас.

***Валянціна Пігас: «Прыснілася», «Люблю свой горад», «Дзяцінства майго берагіня-калыска», «Тропинка, ведущая в детство».***

**Вядучая:** “Мой родны кут, як ты мне мілы!” – сказаў беларускі класік Якуб Колас у паэме “Новая зямля”. Сугучна з ім пішуць многія мясцовыя паэты. Сярод іх і Ніна Пучык з вёскі Стрыгава. Яна таксама прачытае свае вершы з кнігі “Глыток родных крыніц”.

***Ніна Пучык: “На бацькоўскім падворку”, “Запозненае раскаянне”, “Калінавыя пацеркі”, “Сцяжынка ў дзяцінства”.***

**Вядучая:** Як ужо агучвалася, у кнізе “Глыток родных крыніц” прадстаўлена творчасць членаў літаратурнага клуба “ПоэтиКо”. Аматарскае аб’яднанне паэтаў называецца так невыпадкова. Гэта скарочанае слова ад словазлучэння “**Поэти**ческий **Ко**брин”. Невыпадкова абрана і тэматыка першага зборніка клуба. Гэта Кобрын, малая радзіма, родныя краявіды. Менавіта пра гэта піша Надзея Момлік. На жаль, яна не

змагла сёння прысутнічаць на нашай імпрэзе. Таму яе вершы пачытае кіраўнік клуба Наталля Кандрашук.

***Надзея Момлік: “Мой горад”, “Где детство бегало по лужам”, “К родным берегам”.***

**Вядучая:** А цяпер зноў сустракайце Вікторыю Лукашук. Для вас гучыць песня “Растворяясь…”.

***Вікторыя Лукашук «Растворяясь…»***

**Вядучая:** Прыгожая прырода Кобрыншчыны – гэта вялікая натхняльная сіла. Яна не пакідае абыякавым нікога, тым больш, паэтаў. І яны знаходзяць неверагодныя эпітэты і метафары, каб расказаць пра гэту прыгожосць усім навокал. Свае вершы для вас чытае Мырына Міхалюк.

***Марына Міхалюк: «Родныя напевы», «Как в детстве», «Недопетая песня», «Стихия».***

**Вядучая:** Вось вы і пачулі вершы амаль усіх аўтараў кнігі “Глыток родных крыніц”. Засталося толькі пазнаёміць вас з Наталляй Кандрашук – кіраўніком літаратурнага клуба “ПоэтиКо” Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі.

***Наталля Кандрашук: “Я шчаслiва з табою, Кобрын!”, “Жизненный круг», «Загадка лета», «Не хачу сумаваць».***

**Вядучая:** З якіх крыніц паэты чэрпаюць натхненне? Гэтае пытанне нярэдка задаюць творцам. І сапраўды, што становіцца той магутнай сілай, якая падштурхоўвае ўзяцца за пяро і пісаць, пісаць, пісаць?.. Зборнік вершаў «Глыток родных крыніц» часткова дае адказ на гэтае пытанне. А наша літаратурна-музычная кампазіцыя падыходзіць да завяршэння. У якасці апошняга падарунка прымайце песню “Цвета чувств”, напісаную Вікторыяй Лукашук на вершы вядомага паэта Эдуарда Асадава.

***Вікторыя Лукашук “Цвета чувств”.***

**Вядучая:** Вялікі дзякуй усім за ўвагу. Засталося дадаць, што, калі вы пішаце вершы, то мажаце далучыцца да літаратурнага клуба “ПоэтиКо”, пасяджэнні якога праходзяць кожную трэцюю нядзелю месяца а чатырнацатай гадзіне. Да пабачэння! Да новых сустрэч!



# З ПАЭТЫЧНАЙ КРЫНІЦЫ КОБРЫНШЧЫНЫ

*З паэтычнай крыніцы Кобрыншчыны : літаратурная вечарына / ДУК "Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма", Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі. – Кобрын, 2018.*

**Вядучы 1.** Пранікнённае паэтычнае слова заўсёды было і будзе патрэбна людзям. Нават у нашы супярэчлівыя годы... Роднае слова, як гэта пайшло спрадвеку, захоўвае будучыню, умацоўвае веру. Бо Слова мае здольнасць захаваць, абараніць, уберагчы.

Розных па жыццёвым вопыце, па таленце, па манеры мастацкага самавыяўлення паэтаў Кобрыншчыны яднае перакананасць, што сэнс і прыгажосць жыцця – у захаванні вечных духоўных і маральных каштоўнасцей, служэнні дзеля свайго народа і краю.

**Вядучы 2.** Кобрыну не вельмі пашанцавала на літаратурных дзеячаў, горад мае самае прамое дачыненне да літаратурнай спадчыны славянскіх народаў. У 1813-1816 г.г. у Кобрыне і Брэсце служыў ад'ютантам камандзіра рэзервнага палка будучы пісьменнік і дыпламат А.С.Грыбаедаў. Верагодна, што вобразы некаторых сваіх герояў знакамітага "Горе от ума" ён узяў з назіранняў, жывучы ў Кобрыне.

У гады першай сусветнай вайны разам з адступаючай рускай арміяй ў горадзе пабываў Канстанцін Паустоўскі. Аб сваіх уражаннях у час знаходжання ў разбураным горадзе пісьменнік расказаў у апавяданні "Местечко Кобрин".

У верасні-лістападзе 1939г. у горадзе жылі паэт А.Т. Твардоўскі і пісьменнік Б.Л. Гарбатаў, якія супрацоўнічалі з газетай "Вартавы Радзімы". У іх гонар на доме №1 па вул. Суворава ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

Аб адносінах кабрынчан да знакамітых пісьменнікаў і паэтаў-класікаў гавораць назвы вуліц горада: Я. Купалы, Я. Коласа, Мележа, Тургенева, Маякоўскага, Ясе-ніна, Астроўскага, Шолахава, Чэхава, Талстога і г.д., а ў самым цэнтры горада – вуліца Пушкіна.

**Вядучы 1.** З кастрычніка 1898г. у в. Лепясы, што непадалёку ад Кобрына (цяпер у межах горада), у сям'і рабочага нарадзіўся ***Дзмітрый Нічыпаравіч Фалькоўскі (Ляўчук)***. Гэта быў таленавіты чалавек, які дасканала валодаў пяццю мовамі, іграў на фартэпіяна, спрабаваў пісаць музыку. Але найбольш ярка і поўна раскрыўся яго талент у паэзіі. Ён і застаўся ў гісторыі як украінскі паэт.

У 1934 годзе Дзмітрый Фалькоўскі стаў ахвярай палітычных рэпрэсій 1930-х гадоў: ён быў рэпрэсіраваны і расстраляны. Рэабілітаваны ў 1957 г. На жаль, пры жыцці паэт паспеў выдаць толькі чатыры паэтычныя зборнікі. У 1989 г. у Кіеве выдадзены пасмяротны зборнік "Поезії". Кнігу склалі ўсе

лепшыя творы Фалькоўскага з прыжыццёвых зборнікаў, паэмы, а таксама асаобныя вершы. Дарэчы, гэты зборнік ёсць у чытальнай зале цэнтральнай раённай бібліятэкі.

Так склаўся лёс паэта, што ён мала жыў у родных мясцінах: паехаў з Лепясоў юнаком, жыў і пісаў на Украіне, на украінскай мове. Але ў думках ён заўсёды быў з родным краем, перажываў разлуку з радзімай, Лепясамі, што выказаў у сваіх вершах:

Мої далёкі, рідні сёла,
Ніяк, ніяк вас не забуть...

Яго вершы, паэмы – гэта настальгія, незагойваючаяся рана, з глыбіні душы ідучы стогн:

Ах день один, один лишь день
Серед борів своїх пожети.
О, скільки міг би я створіти
Легенд нових, нових пісень,
Та знаюся, що вжэ николи
В свое Поліссе я не прийду.

Талент Фалькоўскага абяцаў шмат. Яго сталасць была наперадзе, але, на жаль, ён не паспеў да канца раскрыць свае здольнасці глыбокага, тонкага лірыка.

Аддаючы належнае паэту-земляку, жыхары вёскі Лепясы назвалі адну з вуліц імем паэта. Ёсць у Лепясах і помнік Дзмітрыю Фалькоўскаму.

**Вядучы 2.** “Дзе прайшло маленства, - сцвярджаў Кузьма Чорны, - там пачынаецца Радзіма”. У адносінах да ***Марыі Радзевіч*** наўрад ці можна гэтае афарыстычнае выказванне прыняць за аксіёму. Не толькі дзяцінства, але амаль усё жыццё Марыі Радзевіч прайшло на Беларусі. Тым не менш яна засталася польскай пісьменніцай і не толькі таму, што пісала па-польску. Менавіта Польшчы пісьменніца з Грушава служыла аддана і самаахвярна. Невыпадкова польскія прыхільнікі яе таленту ў гонар 130-годдзя з дня нараджэння ў былым маёнтку Радзевічаў ў в.Грушава Кобрынскага раёна ўзвялі сціплы памятны знак, па якім па-польску і па-беларуску значыцца: “У памяць выдатнай польскай пісьменніцы Марыі Радзевіч (1864-1944) удзячныя за яе працу гэты памятны знак, устаноўлены пад дубам “Давайцісам”, дораць землякі. Дуб “Давайціс”, на думку грушаўцаў, мае не менш паўтысячагоддзя. Ён не адзінокі, іх цэлая дуброва ў былым грушаўскім двары Радзевічаў.

Маёнтак Грушава быў куплены дзедам пісьменніцы ў нашчадкаў Суворава, якому Кацярына 11 ў знак заслуг на заваяванні Беларусі падаравала землі Кобрыншчыны.

Марыя Радзевіч з 1875 па 1939 г.г. фактычна будзе жыць у Грушаве, пакідаючы яго на кароткі тэрмін. Таму адназначна можна гаварыць пра выключную ролю Палесся ў жыцці пісьменніцы. Тут фарміраваліся яе ідэалы, тут выспяваў яе талент пісьменніцы, тут клалася на паперу большасць яе твораў, тут разгортвалася яе грамадская, рэлігійная,

гаспадарчая дзейнасць. Талент Марыі Радзевіч фарміраваўся падуплывам прыроды і фальклору Палесся, светаадчування палешука. Пісьменніца добра ведала край, дзе ёй наканавана было жыць, ведала і любіла яго. Краявіды Палесся, яго жывёльны і раслінны свет знайшлі мастацкае асэнсаванне ў многіх яе творах. Многія сюжэты для сваіх твораў Марыя Радзевіч брала з палескага жыцця. Прырода, фальклор, вераванні палешукоў шырока ўвайшлі ў многія творы аўтаркі. Любімыя яе героі жывуць у згодзе з прыродаю, трымаюць у дварах лісаў, яжоў. Перакладчыкі твораў Марыі Радзевіч выявілі ў яе апавяданнях і аповесцях шмат слоў Берасцейска -Пінскага Палесся.

Тут яна расла і сталела, стала гаспадыняй родавага маёнтку, ля якога велічна прыгажэў магутны дуб. Давайціс стварыла этнаграфічны музей у лясной хатцы, прымала шматлікіх гасцей з Варшавы, Гародні, сабрала буйнейшую бібліятэку, пісала свае раманы, аповесці, апавяданні, абразкі. У творах Марыі Радзевіч як бы ажывае палеская даўніна, рамантычнаяі праўдзівая, іх сюжэт прыцягвае дынамікай развіцця дзеяння, пераплеценага аўтарскімі развažаннямі, лірычнымі замалёўкамі, у іх – філасофія чалавечага існавання, патрыятызм пачуццяў, багацце фарбаў прыроды. У нашай бібліятэцы ёсць 4 яе кнігі на польскай мове.

**Вядучы 1.** Мікола Цялічка нарадзіўся ў 1923 г. на Чарнігаўшчыне. Быў удзель-нікам Вялікай Айчыннай вайны, закончыў баявы шлях у Германіі ў званні капіта-на. Сваё пасляваеннае жыццё звязаў з Берасцейшчынай. Некаторы час настаўнічаў ў Кобрыне (таму мы яго лічым сваім Кобрынскім паэтам), цяпер жыве ў Брэсце. Выдаў некалькі зборнікаў: “Добрый ливень”, «Дерево в бору», «Вещий свет», «Следы времён». У іх аўтар, як правіла, звяртаецца да свайго франтавога жыцця, апявае салдацкае брацтва, гераічныя традыцыі нашага краю. У гэтым годзе Міка-лаю Рыгоравічу Цялічка споўнілася 80 гадоў. Паслухайце яго верш, які носіць назву нашага горада

***Кобрин***

В шелестящем лиственном наряде
На втором от Бреста рубеже
Город Кобрин встал на автостраде
И стоит всегда настороже.
Здесь в боях империи и классы
В прошлом истекали кровью ран,
И войны Отечественной асы
уходили в небо на таран.
Средь штакетных крашеных заборов,
Низкоросл, отважен и двужил,
Здесь поныне Александр Суворов
Самый знаменитый старожил

**Вядучы 2.** Паэзія – заўсёды свята. Іншай яна і быць не можа па сваёй сутнасці. А самая важная якасць паэта – шчырасць, без яе няма паэзіі.

“Вершы лічу сваім другім жыццём. Паэзіі святло мне запаўняе душу, сэрца... Пішацца верш, і ў сэрцы ўсяляецца светлая надзея на будучае. А з надзеяй і цяжкасці не заўважаюцца. Чароўнае святло паэзіі дапамагае ў гэтым – так сказаў Леанід Глушко. Спадзяюся, што вам знаёма гэта імя, бо Леанід Фёдаравіч часта сустракаецца з моладдзю, наогул са сваімі чытачамі, друкуецца на старонках газет, часопісаў. У 2000 годзе выйшла яго першая кніга “А я веру”. Паслухайце вершы з гэтай кнігі.

Зямля на далонях, бы хлеб,
Грэе дзядулевы рукі.
- Паспела зямелька! - дзед
Кажа з усмешкай унуку. –
Дыхае, бачыш, яна.
І ажывае вясною.
Зямля ў нас, хлопчык, адна –
Як сонецка над галавою.
Вазьмі ты яе, патрымай,
Адчуй цеплыню сваім сэрцам...
Трымае ўнук каравай,
Бы сонца.
І сам – быццам сонца.

***Унуку***

Радасць на сэрцы заўсёды бывае.
Калі ў цябе, хлопча, матуля жывая,
Калі яе рукі цябе абдымаюць,
Калі яе вочы цябе сустракаюць.
... Няма ў мяне мамы, і здымак матулін,
Як мама твая, да слязінак расчуліць.

**Вядучы 1.** У 2000г. выйшла у свет першая кніга і М.Чайнікава, паэта, нашага земляка. Нарадзіўся у 1954г. у Кобрыне, закончыў сярэднюю школу №5. Зараз працуе настаўнікам фізкультуры ў Кобрынскім вучылішчы № 153. “Вершы розных гадоў” – так называецца зборнік, першая кніга М.Чайнікава. Яго паэзія – паэзія думкі. Яна абуджае пачуцці, выклікае на роздум.

Во дворе шумели пацаны,
Юность по Суворовской катилась.
Пыль гребли клешёные штаны.
Юность… неужели мне приснилась?
Мне приснились танцы в РДКа,
Первый поцелуй у старых пушек.
И кружились в парке до утра

Мы, а вместе с нами наши души.
Обгоняя утренние сны,
Мы бежали, пел знакомый кто-то.
Пыль гребли клешёные штаны,
Что ж была тогда такая мода.
Я иду по улице своей.
Здравствуй, мы учились вместе в школе,
Там ещё растёт у входа ель?
Может, на второй этаж заглянем, что ли?
Во дворе шумели пацаны,
Юность по Суворовской катилась.
Эти пацаны уже не мы.
Неужели юность мне приснилась?

***Сосна***
Я задрожала…
В лес вошёл
Тот человек, который зол.
Блестели зубьев жала
Его бензиновой пилы.
С ветвей моих сорвались сны.
Я угадала…
Он пришёл
Тот человек, который зол.
И улыбнулся... Я пропала.
Забилось сердце у пилы,
И дым достигнул высоты,
Я им дышала.
Он ласково погладил ствол,
Тот человек, который зол,
Потом вогнал все жала.
Я долго крикнуть не смогла.
Вдруг закричала…
От боли иглами кору
Царапала, звала сестру.
Но было поздно, я упала.
А человек, который зол,
Точил топор, рубил мой ствол,
И я стонала.

**Вядучы 2.** Адметным і таленавітым маладым драматургам з’яўляецца сёння Ігар Сідарук. Нарадзіўся ён ў 1964 г. у Кобрыне. Тут закончыў школу, пазней – філалагічны факультэт Беларускага Дзяржаўнага універсітэта. Цяпер – загадчык літаратурнай часткі Брэсткага лялечнага тэатра. У літаратуры І.Сідарук вядомы і як паэт - аўтар зборнікаў “Чарнобел”, “Саната Арганата”, “Моўкнасць”. Яго пяру належаць п’есы “Галава”, “Прыгоды Люстрынкі ці Несусветнае зладзейства”. У тэатрах лялек Беларусі пастаўлены яго “Меч Анёла”, “Янка – зух і нячысты дух”, “Звадныя парасяткі”, “Збавіцель”, “Штукатуры”.

**Вядучы 1.** Паважаныя сябры! На жаль, немагчыма ў рамках адной вечарыны расказаць аб усіх паэтах Кобрыншчыны. Але мне хацелася б назваць яшчэ такія імёны: Ніна Дрык – паэтка з в.Балоты, паэт і пісьменнік з вёскі Павіццё Уладзімір Дзехцярук (жыве ў Эстоніі), Лявон Валасюк з в.Песцянькі, Васіль Барысюк з в. Малыя Корчыцы, Любоў Шчаслівая з в. Корчыцы, Лідзія Жук (нам.дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце ПТВ-153 тэкстыльшчыкаў), Зінаіда Навасад, Васіль Лазарчук з в.Буховічі, Іван Чарота. Гэты пералік можна працягваць, бо з’яўляецца многа новых аўтараў, якія толькі спрабуюць свае сілы ў паэзіі.

Усе вы ведаеце, што пры раённай газеце “Кобрынскі веснік” існуе літаратурнае аб’яднанне “Узлёт”, якое адкрывае шмат новых імён, дае жыццё новым вершам, байкам, апавяданням. Літаратурная старонка прапануе чарговыя падборкі твораў нашых кобрынскіх аўтараў, не толькі ўжо вядомых, але і тых, хто друкуецца ў першыню. Яна дае магчымасць рэгулярна знаёміць чытачоў з новымі літаратурнымі здабыткамі Кобрыншчыны. Звяртайцеся да гэтай старонкі і несумненна, у вас застануцца светлыя ўражанні ад сустрэч з усхваляваным словам многіх аўтараў.

**Вядучы 2** Напісанае – застаецца... Застаецца для будучых пакаленняў, для гісторыі літаратуры Кобрыншчыны.

Мы ведаем, што сярод вас, дарагія сябры, таксама ёсць аматары пяра. З задавальненнем паслухаем вас. Калі ласка.

**Віктарына “Літаратурная Кобрыншчына”**

1. Назавіце прозвішчы вядомых вам літаратараў Кобрыншчыны.

2. Якія пісьменнікі-ураджанцы Кобрыншчыны пісалі на украінскай і польскай мовах?

*(З. Фалькоўскі, М.Радзевіч)*

3. Назавіце прозвішчы знакамітых рускіх пісьменнікаў, якія наведалі г. Кобрын у розныя гады?

*(Грыбаедаў 1813., Паустоўскі 1905, Гарбатаў, Твардоўскі 1939)*

4. Хто з пісьменнікаў Кобрыншчыны піша драматычныя творы?

*Ігар Сідарук (адказ п’ес аўтара“Галава” ідзе на сцэне Мінскага тэатра “Хрыстафор”)*

5. Якія з сучасных Кобрынскіх паэтаў маюць выданныя кнігі?

*(І. Сідарук, Л. Глушко, М. Чайнікаў, Л. Валасюк, Л. Жук, Л. Шчаслівая)*

6. Якія вуліцы ў Кобрыне носяць назвы літаратараў?

*(вул. Пушкіна, Маякоўскага, Астроўскага,Я.Коласа, І.Мележа і інш.)*



# ЗАЛАТЫ РОССЫП ВЕРШАЎ

*Залаты россып вершаў : фестываль паэзii / ДУК "Кобрынская раённая цэнтралiзаваная бiблiятэчная сiстэма", Кобрынская цэнтральная раённая бiблiятэка, аддзел абслугоўвання i iнфармацыi. – Кобрын, 2018.*

*Мерапрыемства накiравана на абуджэнне ў сённяшняй моладзi цiкавасцi да паэзii, да творчасцi мясцовых аўтараў.*

***Афармленне зала:*** выстава – панарама "Залаты россып вершаў", цытаты аб паэзii:

*"Лучшее в каждом языке – литература. Лучшее в литературе – поэзия. Поэтому хороший поэт является сокровищем нации" (И. Бродский).*

*"В душе каждого человека есть капкан, отворяющийся только поэзией" (Н. А. Некрасов).*

*"Не сочиняйте слабые стихи,*
*Ведь в них нет жизни, нет души, полёта...*
*Стихи как дети, их не обижайте.*
*От сердца стих вовеки не предаст.*
*Поэты, вы себя не предавайте".*

*Ю. Харевич «Поэтам»*

***Абсталяванне***: мультымедыйная ўстаноўка, ноутбук, аўдыязапiсы, мiкрафоны.

***Форма правядзення***: фармат вiдэапрэзентацыi.

*На экране – назва мерапрыемства – "Залаты россып вершаў" : фестываль паэзii.*

**Вядучы.** Добры дзень, паважаныя сябры! Сённяшняе мерапрыемства прысвечана паэзii. А паэзiя - заўсёды свята, iншай яна i не можа быць па сваёй сутнасцi. Пранiкнённая паэтычнае слова заўсёды было i будзе патрэбна людзям. Нават у нашы супярэчлiвыя гады…

*Гучыць "Паланэз" М. Агiнскага*

Ты – боль, паэзiя. Ты – быль.
Твае суровыя законы
Не для забаў, не для гульбы –
А пошук iсцiны да скону.
Ты – рай, паэзiя. Ты – рой
Адвечных дум, дзе мы згараем.
I толькi генii парой
Жылi часова гэтым раем.
Ты – жаль, паэзiя.

Ты – жар.
Я па тваім хаджу вуголлі.
Чыя не прагнула душа
Тваіх зняволення і волі?!
Ты – сум, паэзія. Ты – суд
І мрояў нашых, і здзяйсненняў.
Хай душы шчырыя нясуць
Высокі лад тваіх памкненняў…

*Леанід Галубовіч “ Паэзія”*

*На экране* – ***“Маладосці – 65”*** *(да 65-годдзя з пачатку выдання літаратурна-мастацкага часопіса).*

**Вядучы.** Красавік – юбілейны месяц для літаратурна-мастацкага і грамадска-палітычнага часопіса “Маладосць”. 65 гадоў таму выйшаў у свет яго першы нумар, які, як для многіх чытачоў, так і для некалькіх пакаленняў беларускіх пісьменнікаў, стаў любімым выданнем.

*На экране – партрэты рэдактараў часопіса “Маладосць”*

У розныя часы часопіс узначальвалі выдатныя беларускія творцы : Алесь Кулакоўскі, Пімен Панчанка, Алесь Асіпенка, Генадзь Бураўкін, Васіль Зуёнак, Анатоль Грачанікаў, Генрых Далідовіч.

*На экране – вокладкі часопісаў “Маладосць”за розныя гады.*

Тут публікаваліся і публікуюцца тысячы празаічных і паэтычных твораў беларускіх літаратараў. Вы ведаеце, калі б сабраць разам усе нумары часопіса (больш за 700), дык па іх можна было б вывучаць усю нашу нацыянальную літаратуру другой паловы 20 стагоддзя, літаратуру – таленавітую, яркую, самабытную, праз якую адкрываліся свету мы – беларусы.

Часопісу “Маладосць” аддавалі права першай публікацыі Якуб Колас, Іван Мележ, Аркадзь Куляшоў, Іван Шамякін. Тут і сёння дэбютуюць шматлікія беларускія пісьменнікі і паэты. Трэба адзначыць, што ў часопісу друкуюцца паэзія маладых найперш, і творы больш сталых аўтараў, каб не парывалася сувязь пакаленняў.

Гэта да яго, у аддзел паэзіі “Маладосці” маладыя паэты нясуць свае першыя радкі і заўжды адчуваюць зычлівую падтрымку. Сярод дэбютантаў часопіса пад рубрыкай “Упершыню ў “Маладосці” друкаваліся вершы і кобрынскіх аўтараў: Васіля Барысюка, Лявона Валасюка, Ірыны Агеевай, Алеся Паплаўскага, Ігара Сідарука, Уладлены Дырды.

Сёння прагучыць вершы нашых мясцовых паэтаў, якія ў розныя часы былі апублікаваны ў часопісу “Маладосць”.

*Чытачы. Гучаць вершы Ірыны Агеевай, Васіля Барысюка, Уладлены Дырды.*

**Вядучы.** Паважаныя сябры! Чытайце часопіс “Маладосць” - і вы будзеце ведаць пра сучасны літаратурны працэс, зможаце адкрываць для сябе новыя імёны беларускіх паэтаў, у тым ліку і нашых кобрынскіх аўтараў.

*На экране – вокладка кнігі М. Гусоўскага “Песня пра зубра” (да 490-годдзя першай публікацыі часопіса).*

**Вядучы.** А зараз яшчэ аб адной юбілейнай даце. У бягучым годзе спаўняецца 490 год з дня першай публікацыі паэмы Міколы Гусоўскага “Песня пра зубра”, твора высакароднага сваім гуманістычным пафасам.

Бясспрэчна, што толькі мастацтва, пабуджальнай сілай якога з’яўляюцца гуманныя ідэалы, здольна ўзбагачаць чалавецтва маральнымі і эстэтычнымі каштоўнасцямі. У паэме Міколы Гусоўскага тэма гуманізму, веры ў чалавека і яго высокае прызначэнне на зямлі як бы “прарастае першым семем на некранутым полі” праз карціны трагедый і пакут цэлых народаў…

На нашым мерапрыемстве прысутнічаюць майстры і навучэнцы каледжа будаўнікоў г. Кобрына. Сёння яны не толькі слухачы, але і ўдзельнікі фестывалю паэзіі. Паслухаем у выкананні прадстаўнікоў каледжа (Віктара Андрасюка, Руслана Вабішчэвіча, Дзмітрыя Свірыдзюка, Юрыя Макарэвіча) урывак з музыкальна-паэтычнай кампазіцыі, прысвечаны юбілейнай даце паэмы Міколы Гусоўскага “Песня пра зубра”. Дарэчы, менавіта гэтая пастанова была прадстаўлена на конкурсе мастацкай самадзейнасці і атрымала прызавое месца.

*Гучыць музыкальна-паэтычная кампазіцыя “Край наш – прыстанак загадак і цудаў”.*

*На экране – фотавернісаж “**Паэт. Чытач. Бібліятэка.** ”*

**Вядучы.** Ад творчасці заўжды натхненне адчуваю,
Цікава вельмі вершы мне складаць,
Ды ў глыбіні душы з трывогаю чакаю,
Чытач што скажа, як пачне чытаць.
Для чытачоў мой сціплы верш – крыніца ведаў,
Бо з неба ён спадае мне ў душу…

Невыпадкова мы называем нашых мясцовых паэтаў сябрамі бібліятэкі. Менавіта яны з’яўляюцца аўтарамі твораў, якія мы, бібліятэкары, прапануем нашым чытачам; яны - жаданыя госці і непасрэдныя ўдзельнікі бібліятэчных мерапрыемстваў. Аб гэтым ярка сведчыць фотавернісаж “Паэт. Чытач. Бібліятэка”.

*На экране – фотаздымки вокладак кніг кобрынскіх аўтараў.*

Стала выдатнай традыцыяй праводзіць сустрэчы з новымі кнігамі ў сценах бібліятэкі. У нас адбыліся прэзентацыі першых кніг Леаніда Глушко, Міхаіла Чайнікава, Надзеі Самасюк, Наталлі Кандрашук; мы знаёміліся з кнігамі і новымі вершамі Леаніда Валасюка, Лідзіі Жук, Любові Шчаслівай, Ігара Сідарука, Алеся Паплаўскага…

*На экране - **“На літаратурным Парнасе Кобрыншчыны”:** прэм’ера-прэзентацыя кніг, вершаў кобрынскіх аўтараў.*

**Вядучы**. Сёння у рамках нашага літаратурнага фестывалю пройдзе бліц-прэм’ера кніг, вершаў кобрынскіх аўтараў, якія выйшлі ў свет у 2013 г.

З задавальненнем перадаю слова кіраўніку літаратурнага аб’яднання “Белы бусел” ***Людміле Іванаўне Лазюк.*** Калі ласка.

*На экране – вокладка кнігі **В. Нявесценка** “Солдаты необъявленной войны». Аўтар знаёміць аудыторыю з кнігай, гучаць вершы з кнігі.*

*На экране – вокладка кнігі **В. Літошык** “Чудесные друзья”, выдадзеная па благаславенню Патрыярха Беларусі Філарэта. Ідзе размова аб кнізе, якая была прадстаўлена на XX міжнароднай кніжнай выставе ў Мінску, якая праходзіла ў студзені 2013 г.*

*На экране - партрэт паэта-барда Ю. Харэвіча і цытата з яго верша”Паэтам”.*

***Ю. Харэвіч** чытае свае новыя вершы, выконвае песні.*

*На экране – **“Добрыя думкі, чыстае сэрца”***

*Гучыць песня Ю. Харэвіча “ Дарога да бога” у выкананні аўтара.*

**Вядучы.** “Добрыя думкі, чыстае сэрца”… Нездарма такую назву носіць чарговы блок нашага мерапрыемства, бо знаходзімся мы напярэдадні вялікага свята – Пасхі. Тэма духоўнасці прысутнічае амаль у творчасці кожнага кобрынскага паэта. Цытатай да гэтай рубрыкі з’яўляюцца словы з верша кобрынскай паэткі Любові Шчаслівай «О дне духовного воскресения»

От пут уныния и муки
Освобожусь, и станут вновь
Яснее краски, чище звуки
И лучезарнее любовь.

Працягвае нашу размову ***Людміла Лазюк***.

У наш імклівы час мы забываем аб галоўным. Некалі падумаць пра душу, пра тое, што сэрца павінна быць добрым і чыстым. Сутнасць свята Вялікдня, вядома ж, не ў абмежаванні ў ежы, а ў тым, каб ачысціцца духоўна, узвысіцца над мітуснёй жыццёвых будняў, падумаць пра сэнс жыцця...

Тэма духоўнасці гучыць у вершах такіх кобрынскіх паэтаў, як Н. Галаванава, В. Клачковіч, С. Камісарук, В. Літошык, Ю. Харевіч, Л. Шчаслівая, Л. Ярмалюк. В. Жарын працуе над кнігай “Мае паломніцтва ў Іерусалім”.

Сёння ў зале прысутнічаюць Юрый Харевіч (паэт-бард, лаўрэат і дыпламант шматлікіх конкурсаў); Людміла Ярмалюк (маладая, таленавітая паэтка, дыпламант 1 ступені ў намінацыі “Паэзія” на фестывалі “Сонечны”); Валянціна Клачковіч (піша добрыя, мудрыя вершы, умее знайсці словы, якія даходзяць да сэрца чытачоў, часта друкуецца). У выкананні саміх аўтараў паслухаем вершы на тэму веры, духоўнасці.

*Кобрынскія паэты Валянціна Клачковіч, Людміла Лазюк, Юрый Харэвіч, Людміла Ярмалюк чытаюць свае вершы на тэму духоўнасці, веры, маралі.*

*Гучыць песня Ю. Харэвіча "Веру" у выкананні аўтара.*

**Вядучы.** Завяршаем наш фестываль паэзіі такімі радкамі Іосіфа Броцкага: " Лучшее в каждом языке – литература. Лучшее в литературе – поэзия. Поэтому хороший поэт является сокровищем нации".

Да новых творчых сустрэч, паважаныя сябры!



# І ВЕРШАМ ГАВАРЫЦЬ ХАЧУ Я

*І вершам гаварыць хачу я… : свята-прэзентацыя новых кніг мясцовых паэтаў / ДУК "Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма", Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі. – Кобрын, 2016.*

*Афармлена кніжная выстава «Роднай зямлі галасы».*
*Складзена літаратурнае дасье «Леанід Глушко».*
*Падрыхтавана віктарына «Літаратурная Кобрыншчына».*
*Для вядзення вечара - два вядучых і некалькі чытальнікаў.*

***На сцэне:*** 2 журнальных століка, за адным - 2 вядучых, за другім - паэты Л. Глушко і М. Чайнікаў.

**Вядучы 1.** З чаго нараджаецца любоў чытача да пісьменніка, паэта? Перш за ўсё - з ведання яго творчасці. Няма гэтага ведання, няма і любові. Менавіта з гэтай нагоды мы сёння сабраліся ў нашай бібліятэцы. Сабраліся, каб бліжэй пазнаёміцца з творчасцю нашых мясцовых паэтау: Леаніда Фёдаравіча Глушко і Міхаіла Юр'евіча Чайнікава. Мінулы год стаў па-сапраўднаму знакамітым у жыцці гэтых двух людзей, збылася запаветная мара любога аўтара: выйшлі ў свет іх кнігі: «А я веру» Л. Глушко, «Стихи разных лет» М. Чайнікава.

**Вядучы 2.** У зборніках нашых землякоў змешчаны вершы, напісаныя ў розныя гады, на розныя тэмы, для чытачоў розных узростаў. Але ва ўсіх іх ёсць агульнае. Гэта - любоў да роднага краю людзей, што насяляюць яго, трывога за іх лёс і вера, што ён будзе шчаслівы.

**Вядуч ы 1.** Паэзія - заўсёды свята. Іншай яна і быць не можа па сваёй сутнасці. А самая важная якасць паэта - шчырасць, без яе няма паэзіі.

«Вершы лічу сваім другім жыццём. Паэзіі святло мне запаўняе сэрца, душу... Пішацца верш, і ў сэрца ўсяляецца светлая надзея на будучае. А з надзеяй і цяж-касці не заўважаюцца. Чароўнае святло паэзіі дапамагае ў гэтым» - так сказаў Леанід Глушко. Відаць, трэба было пражыць на гэтай зямлі 60 гадоў менавіта паэтам, каб напісаць такія радкі:

З Надзеяй лёгка па жыцці ісці,
З верным сябрам, гэта разумею.
Таму ніколі, ні за што ў жыцці
Я не пакіну светлую Надзею.

**Вядучы 2.** Паэзіі Леаніда Фёдаравіча наогул уласціва радаснае успрыманне жыцця. Ён закаханы ў сваё Палессе. З замілаваннем гаворыць пра людзей-працаўнікоў. Нездарма і ў загаловак кнігі вынесены словы веры,

як прызнанне ў нялёгкі сённяшні час, - «А я веру...» Ключом да ідэйнай сутнасці кнігі з'яўляецца верш «Радзіма».

**Чытальнік (1) - верш «Радзіма».**

Няма радзімы без сяброў,
Без светлага кахання,
Як немаўлятаў - без буслоў,
Як сонца - без світання.
Няма радзімы без вясны,
Як без пасаджанай рабінкі.
Мая любоў - мой край лясны! -
Як гэта неба без хмурынкі.
І твой блакіт, валошкі сінь,
Бы вочы матчыны струменяць!..
Радзіма, я твой крэўны сын,
Цябе замежжы не заменяць.

**Вядучы 2.** Не сказаць, што Леанід Фёдаравіч прайшоў лёгкае жыццё. Памяць яго захавала жахлівыя ўражанні вайны. Ды і працоўнае жыццё не было ўсыпана ружамі: працаваў калгасным паштальёнам, мастаком-афарміцелям, спрабаваў ся-бе ў журналістыцы, выкладаў урокі чарчэння і малявання. І ўсё ж, амаль у кож-ным яго вершы - бязмежная любоў да людзей. Асабліва тых, хто шчырай працай здабывае хлеб.

**Чытальнік (2)**
**«Зямля на далонях, бы хлеб»**

Зямля на далонях, бы хлеб,
Грэе дзядулевы рукі. -
- Паспела зямелька! - дзед
Кажа з усмешкай унуку. -
Дыхае, бачыш, яна.
І ажывае вясною.
Зямля ў нас, хлопчык, адна -
Як сонейка над галавою.
Вазьмі ты яе, патрымай,
Адчуй цеплыню сваім сэрцам
Трымае ўнук каравай,
Бы сонца.
І сам - быццам сонца.

**Вядучы 2.** Леанід Глушко - паэт шырокага жанрава-тэматычнага дыяпазону. З сыновым болем ён гаворыць пра мінулую вайну і яе незлічоныя ахвяры; пра журботных асірацелых маці, дзеці якіх загінулі. Праз прызму свайго ўспрымання і сёняшніх пазіцый, піша пра трагедыю Чарнобыля. Як вядома, сімвал Беларусі -бусел. Для вершаў Леаніда Фёдаравіча бліжэй

паняцце «чарнобыльскі бусел». З'яўленне птахі у радыяцыйных мясцінах, дзе нават людзям небяспечна жыць, выклікае невясёлыя думкі.

**Чытальнік (1) - вершы: «Кружыць бусел, родны бусел», «Звіняць Чарнобыля званы»**

Кружыць бусел, родны бусел
Не знаходзіць хаты той,
Дзе пад небам Беларусі
Збудаваў гняздо вясной.
Дзе пражыў нямала летаў,
Птушанят-дзяцей расціў.
Скуль не раз у вырай злётаў,
А застаўся, вось, адзін.
Паваліліся хаціна,
Зруйнаваны сад датла...
Кружыць бусел-сіраціна
Над абломкамі жытла.
Магілу знойдзе...

І не адно яшчэ дзіця
Хто сёння пойдзе ад жыцця,
Хто заўтра пойдзе.
Пакуль яшчэ жывыя мы,
Але - чакаюць
Нас адпяваюць.
Звіняць Чарнобыля званы,

**Вядучы 1.** Побач з успамінамі дзяцінства (а такіх вершаў у зборніку нямала) абавязкова прысутнічае маці. Яна павучае, ставіць дзяцей на ногі. Апяваючы «малую радзіму», паэт вяртаецца ў свет матчыных песен. Гэта вершы «На руках матулі», «Каласы», «Мова матулі», «Унуку».

Радасць на сэрцы заўсёды бывае.
Калі ў цябе, хлопча, матуля жывая,
Калі яе рукі цябе абдымаюць,
Калі яе вочы цябе сустракаюць.

**Вядучы 2.** Чалавек з вострым зрокам, Леанід Фёдаравіч не праходзіць міма заган чалавечага жыцця. Трывогай душы прасякнуты яго сатырычныя і жартоў-ныя вершы, байкі.

**Чытальнік (2)**

**«Баба Соня і секс».**

Наваднілі сексам фільмы,
Тэлеперадачы.
Паспяшае баба Фіма

Да экрана з дачы.
- Прыязджай на тэлік, Соня, -
Братаўку гукае. -
Модны секс пакажуць сёння,
развядзеш рукамі.
... З пацалункаў фільм пачаўся.
Дзея ля Берліна.
Лоўка гіцаль агаляўся,
Распранаў дзяўчыну.
Разгарачаны мужчына
Круціць голым задам.
А пад ім ляжыць дзяўчына
Цела ўецца гадам.
Баба Соня:
- Як сабакі,
Глянь ты, прынародна
Паказалі ўсім нам с..., -
Бо цяпер так модна!

**«Хаўтуры па слану»**

(амаль байка)
Лес абляцела навіна:
Забіў Камар Слана
Такі маленечкі Камар,
А бач, які ў яго
Удар!
Улесегора.
Вянкоў і кветак мора.
Сланіха вочы выцірае,
Мядзведзь журботна галавой хітае,
Ліса зашылася ціхутка ў кут...
Камар!
Ды тут
Прачнуўся Слон і пазяхнуў,
Вянок жалобны адпіхнуў.
Камар дык першы разгубіўся,
Як ліст асенні, задрыжаў
і хуценька перахрысціўся...
А Слон пасля да ўпаду рагатаў:
- Выходзіць, мерцвяком я сонны стаў?
Ну і хвалько ты ў нас, Камар!
Ну і званар!

**Вядучы 1.** Любімая тэма Л.Глушко - вершы для дзяцей. Як для дарослых, так і для маленькіх, ён піша аднолькава цікава, з хітрынкай. Вершы вабяць сваёй красамоўнасцю, мноствам цікавых назіранняў. Нездарма некаторыя з твораў яго дзіцячай падборкі ўключаны ў кнігу для пазакласнага чытання, выдадзеную «На-роднай асветай».

**Чытальнік (1)**
**«Вожык - ягаднік»**
По сцяжынцы тупаў вожык,
Нёс сунічак поўны кошык.
Замарыўся, успацеў,
Адпачыць на пень прысеў.
Зайчанятак не пужае,
А ласкава запрашае:
- Вы частуйцеся, сябры,
Шмат сунічак у бары!..
Паглядзеў на кошык вожык,
Бачыць: апусцеў ён, кошык.
На палянку да крынічкі,
Зноў пайшоў збіраць сунічкі.

**Вядучы 2.** У мінулым годзе Леанід Фёдаравіч адзначыў сваё 60-годзе. З вяршы-ны пражытага хочацца ўжо не толькі пераказаць яркія ўражанні жыцця,
але і асэнсаваць свае назіранні, выявіць момант ісціны. У гэтым плане характэрны верш «Маё жыццё, бы ліст».
**Чытальнік (1)**
**«Маё жыццё, бы ліст...»**
Маё жыццё, бы ліст, трымціць.
Мне б шчэ пажыць, прашу я ў
Што заўтра будзе? З цемры ці
Нас вывядзе дарога?
Не бачна спераду святла.
Адны трывогі ў нашых душах,
І аніякага цяпла
І аніякага цяпла.
Бога. І скрушна...
Дайшоў наш бедны люд
Да неймавернага адчаю.
А я ўсё ж веру, прыкмячаю,
Што прыйдзе Бог, што знікне бруд.

**Вядучы 1 .**
Паэт пачынаецца са Здзіўлення
Паэт пачынаецца з Дабрыні,
З Любові, з Трывог, з Абнаўлення
У Праўдзе - яго карані.

Калі ласка, знаёмцеся - ***Леанід Фёдаравіч Глушко***.
Слова прадстаўляецца Л. Ф.Глушко.

**Вядучы 2.** На прэзентацыю кнігі Л. Глушко прыйшла паэтка Ніна Дрык, якая з радасцю сустрэла вестку аб выхадзе першай кнігі свайго сябра, саратніка па пяру. (Крытычны аналіз вершаў з кнігі «А я веру»).

**Вядучы 1.** Калі прозвішча Леаніда Глушко знаёма многім па апублікаваных на старонках газет вершах, яго ўдзелу ў шэрагу мерапрыемстваў нашай бібліятэкі, то знаёмства з ***Міхаілам Юр'евічам Чайнікавым***, яго творчасцю, думаю, стане сапраўдным адкрыццём для ўсіх нас.

**Вядучы 2.** Міхаіл Чайнікаў - вельмі цікавы неардынарны чалавек, чалавек творчага пошуку. Ён - наш зямляк. Нарадзіўся ў 1954 годзе ў г. Кобрыне. Тут закончыў сярэднюю школу № 5. Паступіў ў Ленінградскі педыятрычны інстытут, але пасля заканчэння 4-х курсаў расчараваўся ў прафесіі медыка. Быў прызваны ў армію, потым працаваў слесарам, фельдчарам, грузчыкам. Міхаіл - выпускнік філалагічнага факультэта Брэсцкага педагагічнага інстытута. Перыядычна выкладаў рускі язык і літаратуру ў школах нашага горада, працаваў настаўнікам і інструктарам фізкультуры на базе адпачынку «Лясная казка», дзе аздараўляюцца дзеці з чарнобыльскай зоны. Зараз працуе настаўнікам фізкультуры ў Кобрынскім вучылішчы № 153. Падарожнічаў па гістарычных мясцінах Расіі, Літвы, Польшчы, быў ва Францыі. Захапляецца рускай і зарубежнай літаратурай, добра ў ёй разбіраецца.

**Вядучы 1.** Міхаіл пачаў пісаць вершы ў час воінскай службы. Друкаваўся ў раённых і шматтыражных газетах Брэсцкай вобласці. На некалькі яго вершаў напісана музыка. «Вершы розных гадоў» - так называецца зборнік, першая кніга Міхаіла Чайнікава. Яго паэзія - паэзія думкі. Яна абуджае пачуцці, перажыванні, выклікае на роздум.

**Чытальнік (2)**
**«Видно, есть где-то ангел-хранитель»**
Видно, есть где-то ангел-хранитель,
Бережёт от невольных грехов.
Мой двойник, мой доверчивый зритель,
Моё «я» неразгаданных снов.
Незнакомец до боли знакомый

Каждый день он, незримый, со мной.
В миг последний прощальной истомыОн поддержит могучей рукой,
Проведёт и покажет дорогу
К чистым душам и светлым садам
И в слияньи познаю я Бога,
Ведь душою я часть его сам.
Что же дальше? Откроются двери?
Это знать мне пока не дано.
Ощущаю незримо и верю
Во Вселенное волшебство.

**Вядучы 2.** Адметныя рысы вершаў Чайнікава - іх задушэўнасць, даверлівасць. Паэт задумваецца над справаздачнымі катэгорыямі дабра і вернасці, сяброўства і кахання, спыняецца перад самым вартасным і прыгожым.

**Чытальнік (1)**

**«Во дворе шумели пацаны...»**

Во дворе шумели пацаны,
Юность по Суворовской катилась.
Пыль гребли клешёные штаны,
Юность.. неужели мне приснилась?
Мне приснились танцы в РДКа,
Первый поцелуй у старых пушек.
И кружились в парке до утра
Мы, а вместе с нами наши души.
Обгоняя утренние сны,
Мы бежали, пел знакомый кто-то.
Пыль гребли клешёные штаны,
Что ж была тогда такая мода.
Я иду по улице своей.
Здравствуй, мы учились вместе в школе,
Там ещё растёт у входа ель?
Может, на второй этаж заглянем,что ли?
Во дворе шумели пацаны,
Юность по Суворовской катилась.
Эти пацаны уже не мы.
Неужели юность мне приснилась?

**Вядучы 1.** Інтымнае пачуццё найлепш характарызуе чалавека, глыбіню яго душы. Шчаслівае пачуццё закаханасці ўласціва чалавеку не толькі ў гады юнацтва, але і ў сталым узросце. Вершы Міхаіла Чайнікава пра каханне - гэта споведзь мастака жанчыне. У іх адчуваецца глыбіня лірызму, якая ідзе з сэрца паэта, пяшчота, што жыве ў ім. Каханне героя - зямное і ўзвышаннае,

пазбаўленнае знешняга лоску і бляску. Давайце паслухаем некалькі вершаў, у якіх паэт шчыра давярае самае патаемнае, што так хвалюе нас ўсіх.

**Чытальнік (2)**
**«Мадам, стихи мои перечитайте...»**
Мадам, стихи мои перечитайте,
Судьба моя пусть не тревожит Вас.
С печалью говорю я Вам: прощайте,
С надеждой, что увижу ещё раз.
Я знаю, Вы меня не любите, любви.
Но это я осенним тихим днём
Принёс цветы, и для меня вы будете
Всегда мечтой, наградой, в небе журавлём.
Мадам, стихи мои перечитайте, прощайте...
Я не могу их никому дарить,
Поймите грустного поэта, знайте,
Что с Вами я такой, каким хотел бы
быть.
Дай Бог, и скоро Вы меня забудете,
Я не приду к Вам в розовые сны.
Горячим сердцем снова Вы
полюбите
Чтоб говорить и слышать все слова
Мадам, стихи мои перечитайте,
Когда Вам не захочется любить,
Вы лишь тогда мне скажете:
И лишь тогда захочется мне жить...

**Вядучы 2.** У зборніку ёсць вершы аб прыродзе, прыгажосць і таямніцы якой аўтар бачыць па-свойму, заўважае тое, што незаўсёды бачаць і заўважаюць іншыя.

**Чытальнік (1)**
**«Сосна».**
Я задрожала...
В лес вошёл
Тот человек, который зол.
Блестели зубьев жала
Его бензиновой пилы.
С ветвей моих сорвались сны.
Я угадала...
Он пршпёл
Тот человек, который зол.
И улыбнулся, я пропала.

Забилось сердце у пилы,
И дым достигнул высоты,
Я им дышала.
Он ласково погладил ствол,
Тот человек, который зол,
Потом вогнал все жала.
Я долго крикнуть не могла,
На землю капала смола.
Вдруг закричала...
От боли иглами кору
Царапала, звала сестру.
Но было поздно, я упала.
А человек, который зол.
Точил топор, рубил мой ствол,
И я стонала.

**«Солнце разорвало»**
Солнце разорвало
Лиловый туман.
Утро засияло,
Улыбаясь нам.
В тонкой паугане
Капельки росы -
Дивней нет картины
Утренней красы.
Солнце выше, выше
К лёгким облакам,
Зацепило крыши,
Бросило к цветам.
Нежным изумрудом
Вспыхнула трава.
Это просто чудо -
Час рожденья дня!

**Вядучы 1.** Сёння цяжкі час для грамадства, а для паэзіі - асабліва, таму ў ёй зас-таюцца тыя, хто не можа жыць без напісання вершаў, у каго асабліва баліць душа, каму ёсць, што паведаць.

Ды ўсё, што бачу, ўсё, што чую
Бяру з сабою, берагу.
І вершам гаварыць хачу я
І ўжо іначай не магу.

Думаю, гэтыя словы можна аднесці і да героя нашага вечара. Знаёмцеся, ***Міхаіл Юр'евіч Чайнікаў***. Слова прадстаўляецца М. Ю. Чайнікаву.

**Вядучы 2.** Паважаныя сябры! Вы мелі магчымасць упэўніцца, што зборнікі нашых паэтаў дастойны ўвагі чытача і яны служаць падцвярджэннем таго, што ёсць на Кобрыншчыне паэты.

А зараз мы хацелі б, каб
Вы звярнулі ўвагу на нашу выставу.
«Роднай зямлі галасы».
*Агляд каля выставы*

**Вядучы 1.** Сярод выдатных набыткаў розуму і душы, якія створаны чалавец-твам, самым загадкавым, незвычайным было і застаецца паэтычнае слова. Кожнае пакаленне, якое прыходзіць у свет, па-свойму разгадвае таямніцы сапраўднай паэзіі.

Але заўсёды ў сэрцы чытача застаецца адчуванне недасягальнасці. «Паэзія -самы няўлоўны сакрэт, які не будзе нікім рассакрэчаны», - сцвярджае паэт Беларусі Пімен Панчанка.

**Вядучы 2.** У сённяшнім Кобрыне нямала знатакоў і аматараў паэзіі, многія з іх спрабуюць акунуцца ў творчы, захапляючы і чаруючы свет паэзіі. Вельмі добрыя прыкметы паэзіі - сведчанне аб яе пераемнасці. Зараз вашай увазе прадстаўляем маладую цікавую жанчыну, якая таксама піша вершы. Гэта ***Цярэнцьева Наталля Ігараўна***. Пакуль, што не было яе публікацыі ў прэсе. Але спадзяемся, што пасля сённяшняй сустрэчы яны з'явяцца. Наталля наогул таленавіты чалавек. Добра малюе, пушча песні на свае вершы, сама іх выконвае. Яе прызванне - лірыка.

Слова Цярэнцьевай Н. І.

### Віктарына «Літаратурная Кобрыншчына»

**Вядучы 2 .**

**1.** Назавіце прозвішчы вядомых вам літаратараў Кобрыншчыны.

*(многа прозвішч)*

**Вядучы 1 .**

**2.** Хто з пісьменнікаў Кобрыншчыны піша драматычныя творы?

*(Адна з п'ес аўтара - «Галава» ідзе на сцэне Мінскага тэатра «Хрыстафор»). (І.Сідарук)*

**3.** Прафесіі М.Ю.Чайнікава, Л.Ф.Глушко.

*(педагог мастак)*

**4.** Дзе нарадзіўся Л.Ф.Глушко?

*(в. Курыцічы Петрыкаўскага р-на Гомельскай вобл.)*

**5.** Якія пісьменнікі-ураджэнцы Кобрыншчыны пісалі на украінскай і польскай мовах?

*(Дз.Фалькоўскі, М. Радзевіч)*

**6.** Назавіце аўтара кнігі «Квадратная варона»

*(Сідарук)*

**7.** Назавіце аўтара гэтых радкоў: «У мяне, як у сятрычкі,
З цёплай воўны рукавічкі.
Возьмем мы свае лапаты.
Снег расчысцім каля хаты.
Злепім белага мядзведзя,
Хай любуюцца суседзі!
Верш «Хай любуюцца суседзі»

*(Л. Глушко)*

**8.** Хто з самадзейных кампазітараў-землякоў напісаў песні на вершы паэтаў Кобрыншчыны ?

*(Е. Арасланаў, А. Кірыеўскі, А. Шыбут)*

**9.** Назавіце прозвішчы знакамітых рускіх піеьменнікаў, якія наведалі г.Кобрыну розныя гады.

*(А.Грыбаедаў 1813 г.; К.Паустоўскі 1905 г.; Б.Гарбатаў, А.Твардоўскі 1939 г.)*

**10.** Назавіце прозвішча паэткі, аўтара гэтых радкоў. (Верш уключаны ў кнігу «Кобрын» да 710-годдзя горада)
Ля ціхай плыні Мухаўца,
Драўляны замак збудаваў,
Сярод лугоў імшыстых,
Мой светлы горад заснаваны.
Дзе князь - валынскі ўладар.

*(«Роднаму гораду» Н.Дрык)*

**Вядучы 1.** Спадзяемся, што сярод вас, дарагія госці, таксама ёсць аматары пя-ра. З задавальненнем паслухаем, калі ласка.

Слова госцю.

**Вядучы 2.** Паважаныя сябры! Вось і закончылася наша вечарына. Дзякуй вам за увагу і зацікаўленасць. Маем надзею, што размова аб лёсе і творах мясцовых паэтаў падоўжыцца ля кніжных паліц у сценах бібліятэкі.



## КНИЖНАЯ ИМПЕРИЯ

*Ефтифеева, Н. Книжная империя : поэтический нон-стоп / ГУК "Кобринская районная централизаванная библиотечная система", Кобринская центральная районная библиотека, отдел библиотечного маркетинга ; Наталья Ефтифеева. – Кобрин, 2019.*

**Ведущий:** В сентябре 2019 года Кобринской центральной районной библиотеке исполняется 80 лет. И отпраздновать эту знаменательную дату мы решили по-особенному – поэтическим нон-стопом «Книжная империя». Если вы, уважаемые гости и хозяева этого книжного храма, заготовили поздравительные речи, приберегите их. Возможность поздравить библиотекарей вам представится чуть позже. А сейчас мы начинаем литературный праздник, где все выступления будут объединены одной темой. Подскажите мне её.

*Ответы зрителей.*

**Ведущий:** Нашу праздничную программу открывает вокальная группа кобринской библиотеки «Фантазия».

*Вокальная группа «Фантазия» с песней «Библиотекарь».*

**Ведущий:** Накануне 80-летия в библиотеке прошёл творческий конкурс «Радуга созвучий». В конкурсе приняли участие 15 поэтов и писателей, которые прислали 38 произведений в 5 номинаций. К сожалению, не все конкурсанты смогли сегодня посетить наше мероприятие. Тем не менее те из них, кто пришёл в библиотеку, будут приглашены к микрофону.

Номинация **«Поздравление библиотекарю»** предполагала стихотворные пожелания и посвящения представителям этой профессии. Приятно, что двое участников конкурса посвятили стихи первому директору кобринской библиотеки – Алексею Михайловичу Мартынову. Я приглашаю к микрофону ***Эмилию Сушко***.

*Эмилия Сушко «Посвящение Алексею Михайловичу Мартынову»*

**Ведущий:** Ещё одно посвящение первому директору библиотеки прочтёт ***Валентина Литошик.***

*Валентина Литошик «Памяти Алексея Михайловича Мартынова»*

**Ведущий:** Валентина Литошик награждается дипломом победителя и ценными призами за победу в номинации «Поздравление библиотекарю».

*Награждение Валентины Литошик.*

**Ведущий:** А сейчас я предлагаю отгадать загадку:

В ней книжек видимо-невидимо,

А что невидимо, то выдано.
Что это?
*Ответы зрителей.*

**Ведущий:** Вторая номинация конкурса «Стихи о библиотеке». Приглашаю к микрофону ***Надежду Момлик***.

*Надежда Момлик «Посвящение библиотеке»*

**Ведущий:** Для участия в конкурсе принимались произведения как на русском, так и на белорусском языке. Сустракайце: ***Галіна Балахоўская*** з вершам «У бібліятэку завітай».

*Галіна Балахоўская «У бібліятэку завітай»*

**Ведущий:** Как и в первой номинации, среди стихов о библиотеке были посвящения нашему кобринскому книжному храму. Слово предоставляется ***Зинаиде Новосад***.

*Зинаида Новосад «С юбилеем!»*

**Ведущий:** Зинаида Новосад награждается дипломом победителя и ценными призами за победу в номинации «Стихи о библиотеке».

*Награждение Зинаиды Новосад.*

**Ведущий:** Я на свиданье тороплюсь,
Чтоб тихие слова услышать.
Из родника душой напьюсь,
И снова нежность в сердце дышит.
Я так люблю тебя, поверь,
Жду драгоценнейшего мига.
И, отворив обложку-дверь,
Встречаюсь вновь с любимой книгой.

Третья номинация конкурса – «Стихи о книге». Именно в эту номинацию поступило больше всего произведений, в том числе и самое первое, присланное на конкурс, кстати, от единственного мужчины-конкурсанта. Приглашаю к микрофону ***Виктора Дащука***.

*Виктор Дащук «Стихи о книге»*

**Ведущий:** Возвышенные слова её величеству Книге сказали многие конкурсанты, а ***Марина Михалюк*** написала оду книге. Послушаем автора.

*Марина Михалюк «Ода книге»*

**Ведущий:** Из 15 произведений номинации «Стихи о книге» четыре были посвящены Библии. В числе авторов, написавших о самой главной книге человечества – ***Надежда Давыденко***.

*Надежда Давыденко «Библии»*

**Ведущий:** Представляю ещё одного автора, написавшего стихи о книгах. Встречайте – ***Валентина Пигас***.

*Валентина Пигас «Кнігі»*

**Ведущий:** Валентина Пигас награждается дипломом победителя и ценными призами за победу в номинации «Стихи о книге».

*Награждение Валентины Пигас.*

**Ведущий:** В подарок библиотекарям и конкурсантам, а также всем присутствующим звучит *песня «Занавесочки»* в исполнении *Надежды Прокопович*.

**Ведущий:** В конкурсе были и прозаические номинации. Одна из них – «Рассказы о библиотеке». Предлагаем вашему вниманию отрывок из произведения ***Валентины Савчук*** «Книжный храм» в исполнении автора.

*Валентина Савчук «Книжный храм» (отрывок).*

**Ведущий:** Валентина Савчук награждается дипломом победителя и ценными призами за победу в номинации «Рассказы о библиотеке».

*Награждение Валентины Савчук.*

**Ведущий:** Пятая номинация – «Рассказы о книге». К микрофону приглашается ***Степан Давыдюк***.

*Степан Давыдюк «Библиофилы»*

**Ведущий:** А теперь возможность прочитать отрывок из своего рассказа «Па дарозе ў бібліятэку» предоставляется ***Татьяне Сацук***.

*Таццяна Сацук «Па дарозе ў бібліятэку»*

**Ведущий:** Татьяна Сацук награждается дипломом победителя и ценными призами за победу в номинации «Рассказы о книге».

*Награждение Татьяны Сацук.*

**Ведущий:** Спонсорами конкурса выступили иностранное предприятие «Лангхайнрих Конфекцион Бел», Кобринская организация общественного объединения «Белая Русь» и индивидуальный предприниматель Ольга Матюхина.

И ещё одно награждение. За неоднократную творческую помощь Благодарственное письмо вручается *Зинаиде Ивановне Новосад*.

**Ведущий:** А теперь ещё один подарок для всех присутствующих. Театр-студия «Пирожок», работающая на базе Кобринской центральной районной библиотеки, предлагает вашему вниманию сценку «У ворот рая».

Приятного просмотра!

**Ведущий:** Вот и подошло к концу наше праздничный поэтический нон-стоп. Присутствующие здесь библиотекари готовы принимать поздравления от гостей мероприятия.

*Поздравления от гостей.*

**Ведущий:** На этой праздничной ноте позвольте объявить наш поэтический нон-стоп закрытым. Фотографии с мероприятия смотрите завтра на сайте Кобринской районной централизованной библиотечной системы и в группе «Кобринская центральная районная библиотека» в социальных сетях «Одноклассники», «ВКонтакте», «Фейсбук».

До свидания! До новых встреч!



# ЛЮБЛЮ СТОРОНКУ РОДНУЮ

*Ефтифеева, Н. Люблю сторонку родную : презентация поэтического сборника «Глыток родных крыніц» / ГУК «Кобринская районная централизованная библиотечная система», Кобринская центральная районная библиотека, отдел библиотечного маркетинга ; Наталья Ефтифеева. – Кобрин, 2020.*

**Ведущая:** Каждому человеку присуща любовь к родному краю, к той местности, где он родился и где прошло его детство. Поэтому малая родина и её наследие всегда являлись музой для творческих людей. Этим летом в агрогородке Дивин персонажи стародавней свадьбы с участием леликовской свахи воплотились в деревянных скульптурах. Надеемся, что после сегодняшней экскурсии леликовская сваха и свадебные традиции Кобринщины смогут предстать перед нами в поэтическом образе, воплотившись в стихотворных строчках. Лучшие произведения данной тематики смогут занять достойное место на данной выставке.

Пользуясь случаем, объявляем литературный конкурс «Ах, эта свадьба…». В конкурсе всего одна номинация – «Поэзия». В результате будут определены 1, 2 и 3 место.

А пока, дорогие друзья, я предлагаю вам познакомиться с творчеством кобринских поэтов – членов литературного клуба «ПоэтиКо», который работает при Кобринской центральной районной библиотеке. Кстати, в этом месяце нашему клубу исполняется год. Перед вами выступит один из самых активных участников клуба ***Марина Михалюк***.

**Ведущая:** Члены клуба «ПоэтиКо» пишут на белорусском и русском языках. Но есть среди них один уникальный поэт, который пишет ещё и на украинском языке, а также на местном диалекте. Встречайте ***Степана Давыдюка.***

**Ведущая:** "Як ад нараджэньня звяры, што ходзяць у пустыні, ведаюць ямы свае; птушкі, што лётаюць у паветры, ведаюць гнёзды свае; рыбы, што плаваюць па моры і ў рэках, чуюць віры свае; пчолы і тым падобныя бароняць вуллі свае, – так і людзі, дзе нарадзіліся і ўскормлены, да таго месца вялікую ласку маюць", - сказал однажды белорусский первопечатник Франциск Скорина. Любит свою малую родину и ***Валентина Пигас***.

**Ведущая:** 2020-й – Год малой родины. Особенный он и для Кобринщины. В январе этого года исполнилось 80 лет Кобринскому району как административной единице. К юбилею отделом библиотечного маркетинга центральной районной библиотеки издан сборник стихов "Глыток родных крыніц". В сборник вошли поэтические произведения членов литературного клуба «ПоэтиКо». Среди авторов – ***Михаил Чайников***. Предлагаем ему почитать нам свои стихи.

**Ведущая:** Сегодня в гости к леликовской свахе пришли ещё и корреспонденты, благодаря которым кобринчане узнают о событиях, происходящих в городе и районе. И есть среди них уникальный журналист, совмещающий педагогику, журналистику и поэтический дар. Это ***Жанна Елизарова***.

**Ведущая:** А теперь, дорогие друзья, позвольте и мне предложить вашему вниманию свои стихи.

**Ведущая:** Спасибо всем, кто сегодня пришёл вместе с нами в гости к леликовской свахе. Фото с мероприятия можно будет посмотреть на сайтах библиотеки и музея, также в библиотечной и музейной группе в социальных сетях в Интернете. Следите за новостями в группах, чтобы не пропустить интересные мероприятия.



# НАШЫ ВЫТОКІ

*Ефціфеева, Н. Нашы вытокі : літаратурна-музычны салон / Н. П. Ефціфеева. – Кобрын, 2021.*

**Вядучы:** Добры дзень, шаноўныя сябры!
Вас вітаем словам роднай мовы
І жадаем сёння падарыць
Вершаў-песень карагод мясцовы.

Наш літаратурна-музычны салон праходзіць у рамках фестывалю «Вытокі. Крок да Алімпу». Сёння разам з паэтамі мы будзем разважаць аб нашых вытоках – культурных, моўных і наогул жыццёвых. Гасцямі салона сталі паэты і музыканты, якія падораць вам, паважаныя гледачы, сваю творчасць, а разам з ёй і часцінку сваёй душы.

Сустракайце першага ўдзельніка. Сябра народнага аматарскага аб’яднання «Белы бусел» Мікалай Крывагуз выканае песню «З крыніцы п’ю», якую ён напісаў на словы дзівінчанкі Надзеі Момлік.

**Мікалай Крывагуз. Песня «З крыніцы п’ю» – пад гітару.**

**Вядучы:** Родная крыніца – гэта не толькі крынічанька ў прамым сэнсе гэтага слова, але і наша малая радзіма, бацькоўская хата, родная мова, мясцовыя традыцыі і ўсё тое, што звязана з тым месцам, дзе чалавек нарадзіўся. І амаль у кожнага гэта месца выклікае асаблівыя пачуцці. Яшчэ Францыск Скарына сказаў: *«Як ад нараджэння звяры, што ходзяць у пустыні, ведаюць ямы свае; птушкі, што лётаюць у паветры, ведаюць гнёзды свае; рыбы, што плаваюць па моры і ў рэках, чуюць віры свае; пчолы і тым падобныя бароняць вуллі свае, – так і людзі, дзе нарадзіліся і ўскормлены, да таго месца вялікую ласку маюць».*

Тэма малой радзімы гучыць у творах амаль кожнага паэта. Не выключэнне і сябра літаратурнага клуба «ПаэтыКо» Марына Міхалюк.

**Марына Міхалюк. Вершы «Шчасце ёсць!», «Родныя напевы», «Нашчадкам».**

**Вядучы:** Што мы перадададзім сваім нашчадкам? Любоў да радзімы? Вядома. Але каб яны адчувалі гэту любоў, трэба каб яна была не толькі духоўная, але мела і матэрыяльны выгляд. Каб гледзячы на спадчынную рэч, наш нашчадак успамінаў нас, сваё дзяцінства, бацькоўскі дом, малую радзіму. Менавіта пра гэта піша сябра народнага аматарскага аб’яднання «Белы бусел» Галіна Півень.

**Галіна Півень. Верш «Матчын луг».**

**Вядучы:** А цяпер невялічкая музычная паўза. Сустракайце дуэт Вольгі Камінскай і Наталлі Дземідзюк.

**Вольга Камінская і Наталля Дземідзюк.**
**Песні «Каля лугу, каля броду», «Нет, не люблю я Вас».**

**Вядучы:** Беларусы, у тым ліку палешукі, заўсёды славіліся сваёй працавітасцю і здольнасцю да разнастайных мастацтваў, у тым ліку да дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Гэту тэму не абмінаюць у сваіх творах і кобрынскія паэты. Сябра народнага аматарскага аб'яднання «Белы бусел» Валянціна Літошык напісала цудоўны верш на рускай мове «Умелые руки творят чудеса». Яго прачытаюць выхаванцы абъяднання па інтарэсах "Хачу на сцэну" Кобрынскага раённага цэнтра дзіцячай творчасці.
**Верш Валянціны Літошык «Умелые руки творят чудеса».**

**Вядучы:** Народныя традыці жывуць, пакуль іх ушаноўваюць у жыцці і культуры пэўнай мясцовасці, пакуль аб іх гавораць і пішуць. У нашай краіне ёсць Дзяржаўны спіс нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей, у які ў 2018 годзе занесены традыцыі вырабу і выкарыстання строю лелікаўскай свахі Кобрынскага раёна. «Ад прадзедаў спакон вякоў мне засталася спадчына», - сказаў Янка Купала. Гэтую ж думку сцвярджае сваімі вершамі сябра Міжнароднай асацыяцыі пісьменнікаў і публіцыстаў Надзея Момлік. Яна адна з нямногіх, у чыёй творчай скарбонцы ёсць вершы пра лелікаўскую сваху. Да таго ж яна піша вершы не толькі на беларускай і рускай мовах, але і на мясцовым дыялекце. І наогул, у сваёй паэзіі адводзіць пачэснае месца сваім вытокам, сваёй малой радзіме і яе традыцыям.
**Надзея Момлік. Вершы «Лелікаўская сваха», «Ходнык», «Велікодныя дні ў Рэўні».**

**Вядучы:** Спрытны час дыктуе свае ўмовы і шмат чаго мяняе ў нашым жыцці. Але прыемна, што не ўмірае народная культура. Яна застаецца у помніках і вершах, а яшчэ ў музычных інструментах. Сустракайце юнага балалаечніка Даніла Мядзведзева, які сыграе музычную кампазіцыю «Гула пчала", канцэртмайстар Аксана Джусь.

**Вядучы:** Ёсць у Кобрыне тыя, хто захоўвае гісторыю для нашчадкаў. І гэта не толькі настаўнікі гісторыі, паэты і пісьменнікі, але і работнікі ўстаноў культуры, і ў першую чаргу – навуковыя супрацоўнікі Кобрынскага ваенна-гістарычнага музея імя Суворава. Менавіта ім прысвяціла свой верш кіраўнік літаратурнага клуба «ПаэтыКо» Наталля Кандрашук.
**Наталля Кандрашук. Вершы «Хранители истории», «Спрятанная память», «Дзве радзімы».**

**Вядучы:** Куды б ні закінула жыццё чалавека, але ў сваіх думках ён заўсёды будзе вяртацца туды, дзе нарадзіўся, дзе прайшло яго дзяцінства. З усіх шляхоў, далёкіх і блізкіх, мы едзем у бацькоўскі дом, нават калі там ужо ніхто не жыве. Можна з'ехаць з малой радзімы, но яна назаўсёды застанецца

з намі. Пра гэта вершы сябры Саюза пісьменнікаў Беларусі і Міжнароднай асацыяцыі пісьменнікаў і публіцыстаў Міхаіла КулЕша.

**Міхаіл Кулеш. Вершы «Край родной», «Я деревенский», «Телефонный разговор».**

**Вядучы:** Ізноў музычная паўза. Сустракайце Георгія Паляводу з песняй «Беларусь», канцэртмайстар Таццяна Пакалюк.

**Георгій Палявода. Песня «Беларусь».**

**Вядучы:** Думаю, кожны з нас хоць раз у жыцці чуў мясцовы дыялект сваіх продкаў, а можа нават і размаўляў на ім. Наша беларускае Палессе багатае на дыялекты. Нават у адным раёне іх можа быць некалькі, і жыхары суседніх вёсак адны і тыя ж рэчы могуць называць па-рознаму. А што ўжо казаць пра паселішчы, якія раздзяляюць сотні кіламетраў. Своеасаблівы моўны аналіз Кобрыншчыны і Лунінеччыны робіць у сваім вершы сябра літаратурнага клуба «ПаэтыКо» Жана Елізарава.

**Жана Елізарава. Верш «Матчына мова».**

**Вядучы:** Сельская, ці на дыялекце – сільска, мова не загіне. Гэта сцвярджае сваім вершам сябра літаратурнага клуба «ПаэтыКо» Сцяпан Давыдзюк.

**Сцяпан Давыдзюк. Верш «Сільска мова».**

**Вядучы:** Для слыху многіх дыялект, магчыма, гучыць незвычайна. Але ж думаю, што вы, паважаныя гледачы, пагадзіцеся са мною, што ўсё зразумела. Своеасаблівыя дыялекты ёсць і ў музыцы. Ці чулі вы калі-небудзь усім вядомы «Паланэз Агінскага» ў выкананні гітары і домры? Не? Дык зараз у вас ёсць такая магчымасць. На сцэну запрашаюцца Алена Палтарчук і Веніямін Арабей..

**Алена Палтарчук і Веніямін Арабей. «Паланэз Агінскага».**

**Вядучы:** Прырода радзімы – яна заўсёды асаблівая, сама прыгожая, самая чароўная, самая-самая. Магчыма, няма ніводнага паэта, які ў сваёй творчасці не звяртаўся б да тэмы прыроды. Бо водар кветак і шамаценне лістоты маюць вялізарную натхняльную сілу. У доказ гэтага праслухайце вершы сябры літаратурнага клуба «ПаэтыКо» Алены Котавай у выкананні аўтара.

**Алена Котава. Вершы «Затейница», «Май», «Зямля бацькоў».**

**Вядучы:** Тэму роднай прыроды і малой радзімы прадоўжыць сябра народнага аб’яднання «Белы бусел» Наталля Цярэнцьева.

**Наталля Цярэнцьева. Вершы «Ржаное море», «Грибники», «Старый дом».**

**Вядучы:** Мы сёння шмат гаворым пра вытокі натхнення. Але як яно нараджаецца і як прыходзіць звыш, дакладна ўсё роўна ніхто не ведае. Ні паэты, ні мастакі, ні музыканты. Але амаль кожны з іх спрабуе адказаць на пытанне: як ты прыходзіш да мяне, натхненне? Магчыма, вы знойдзіце адказ у музычнай кампазіцыі «Натхненне» ў выкананні Сустракайце трыа Аляксандра Бусько, Наталлі Зубавай і Ліліі Ламекі.

**Аляксандр Бусько (саксафон), Наталля Забава, Лілія Ламека.**

**Музычная кампазіцыя «Натхненне» (саксафон, скрыпка, фартэпіяна).**

**Вядучы:** Куды нас вядуць сцяжыны дзяцінства? Вядома ж, да роднага дома, у той блаславёны куточак, дзе прайшло маленства, дзе мы пачулі матчыну мову – рускую, беларускую ці дыялектную, але матчыну, па-сапраўднаму родную. На гарадскую вуліцу ці ў далёкую вёску – у кожнага свой маршрут. Гэта тое месца, дзе мы гарэзліва гулялі, дзе ўпершыню закахаліся, дзе вучыліся працаваць. Пра свае сцяжыны дзяцінства вам раскажа сябра літаратурнага клуба «ПаэтыКо» Валянціна Пігас.

**Валянціна Пігас. Вершы «Сцяжынаю дзяцінства», «Кусочак раю», «Не губляйце свае карані».**

**Вядучы:** Як трапна сказана: «Не губляйце свае карані». Апошні вершы нашага літаратурна-музычнага салона прагучаў быццам пажаданне для кожнага з нас.

*Не губляйце свае карані!*
*Звяртайцеся да сваіх вытокаў!*
*З крыніц народных чэрпайце натхненне!*

Надышоў час развітання. Але перш, чым пакінуць гэтую залу, я запрашаю ўсіх да кніжнай выставы, на якой вы пазнаёміцеся з творчасцю тых, чые вершы сёння пачулі. Дарэчы, можна набыць аўтарскія кнігі ў асабістую бібліятэку.

Да пабачэння! Да новых сустрэч!



## ПОГОВОРИМ О НОВОЙ КНИГЕ

*Пагаворым аб новай кнізе : час библиографического краеведения / ГУК «Кобринская районная централизованная библиотечная система», Кобринская центральная районная библиотека, отдел обслуживания и информации. – Кобрин, 2015.*

Сегодня, в рамках нашего очередного производственного совещания, состоится презентация первой книги поэзии кобринчанки **Надежды Самосюк «Прими меня такой».**

